Выдаецца з 9 чэрвеня 1917 г.
Родная газета на роднай мове
# ЗВЯЗДА
6 ЛІСТАПАДА 2020 г.
ПЯТНІЦА
№ 217 (29331)
+TV ПРАГРАМА
МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ
ГАЗЕТА ДЛЯ ВЫБАРНІКАЎ І ДЭПУТАТАЎ МЯСЦОВЫХ САВЕТАЎ

## Наша сіла ў гістарычным вопыце

Дарагія суайчыннікі!

Віншую вас з Днём Вялікага Кастрычніка.

Гэтая гістарычная падзея адбылася пад знакам найважнейшых агульначалавечых каштоўнасцяў — нацыянальнага адраджэння народаў і сацыяльнай роўнасці людзей.

Упершыню наша краіна з'явілася на карце свету як палітычны суб'ект, а беларусы зрабілі рашучы крок да афармлення суверэннай нацыі — народа з багатымі традыцыямі, высокай культурай і законным правам на дзяржаўнасць. Правам, якое нашы бацькі і дзяды гераічна адстойвалі ў гады Вялікай Айчыннай вайны. І сёння мы працягваем яго абараняць, пераадолеўшы геапалітычны раскол 1990-х, вытрымаўшы эканамічныя крызісы, адбіваючы выклікі агрэсіўнага знешняга ціску.

Перакананы, што наша сіла ў гістарычным вопыце, які навучыў беларусаў берагчы свае галоўныя дасягненні: бяспеку, мір і згоду ў грамадстве.

У гэты памятны дзень жадаю ўсім грамадзянам нашай роднай Беларусі мудрасці, узаемаразумення і беражлівых адносін да мінулага, якое падарыла нам будучыню!

**Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь**
**Аляксандр ЛУКАШЭНКА.**

## ЦЫТАТА ДНЯ




**ДЗЯРЖАЎНЫ ПАГРАНКАМІТЭТ:**

*«Беларусь прымае неабходныя меры па прадухіленні распаўсюджвання каранавіруснай інфекцыі. Асаблівая ўвага надаецца папярэджанню завозу захворвання з краін з дрэннай эпідэміялагічнай сітуацыяй. У сувязі з гэтым Дзяржпагранкамітэт рэкамендуе грамадзянам і замежнікам, якія пастаянна жывуць у краіне, адмовіцца ад паездак за мяжу. Асабліва ў суседнія краіны, маючы на ўвазе прагназуемае закрыццё імі сваіх межаў па аналогіі з дзеяннямі Літвы, якая спыняе пропуск замежнікаў на ўезд і ўводзіць усеагульны каранцін як мінімум да 29 лістапада. Грамадзянам, якія знаходзяцца па-за межамі Беларусі, рэкамендуецца ўстрымацца ад неабгрунтаваных паездак праз мяжу без вострай неабходнасці да заканчэння тэрмінаў абмежавальных мерапрыемстваў, накіраваных на барацьбу з COVID-19».*

## КОРАТКА

- **Трэцяя лінія мінскага метро забяспечана інавацыйным абсталяваннем для кантролю аплаты праезду.**
- Міжнародны кінафестываль «Лістапад» адменены ў сувязі з эпідэміялагічнай сітуацыяй.
- **У Беларусі адкарэктаваны парадак выдачы льготнага крэдыту на вучобу ў ВНУ.**
- Сустрэча з абітурыентамі адбудзецца ў БДУ 6 лістапада.

ISSN 1990 - 763X

З першых вуснаў

## «Ахова здароўя будзе забяспечана неабходным для аказання медыцынскай дапамогі насельніцтву ў поўным аб'ёме»

### Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка правёў нараду аб супрацьдзеянні распаўсюджванню вірусных інфекцый

**Па словах кіраўніка краіны, эпідэмічная сітуацыя ў свеце на сённяшні дзень развіваецца па адным з самых негатыўных сцэнарыяў. «Я маю на ўвазе не рэкордныя лічбы захворвання ў большасці еўрапейскіх дзяржаў. І нават не поўны лакдаўн у некаторых краінах. Відавочна, што шкода эканомікам будзе нанесена непапраўная, незаменная, але зараз думаць варта не пра яе. Яшчэ не паспелі з'явіцца эфектыўныя і надзейныя лекі ад каранавіруса, а ён ужо муцыраваў і стаў прыстасоўвацца да ўжываных метадаў барацьбы з ім», — выказаў заклапочанасць Аляксандр Лукашэнка.**

СТАР. 2



Фота БелТА.

# ВАЛАДАР ВОСЕНЬСКАЙ МЯЦЕЛІЦЫ



Дванаццаць гадоў Сяргей ХАРОШКА працуе ў Нясвіжскім зелянгасе і часта нясе службу па навядзенні парадку і чысціні ў гарадскім парку, які з'яўляецца неад'емнай часткай палаца-паркавага ансамбля былой рэзідэнцыі Радзівілаў. А яшчэ Сяргей абразае дрэвы і кустоўе, восенню ачышчае сцежкі і алеі, дарогі і тратуары ад апалага лісця. За гэтым заняткам я і сфатаграфаваў паркавага рупліўца.
**Анатоль КЛЯШЧУК, фота аўтара.**

Спажывец

# Абслугоўванне на колах

### Карэспандэнт «Звязды» пабывала ў Капыльскім раёне, што на Міншчыне, і паглядзела, як тут наладжана абслугоўванне жыхароў аўтакрамамі

**З кожным годам у сельскай мясцовасці змяншаецца колькасць жыхароў. Старыя адыходзяць у іншы свет, а моладзь пакуль рэдка пераязджае на малую радзіму. Паралельна ў многіх вёсках зачыняюцца стацыянарныя магазіны. Іх проста немэтазгодна тут трымаць. Вялікія выдаткі ідуць на аплату камунальных паслуг, электрычнасці, ацяплення, зарплату прадаўцу. Разам з тым дзяржава не пакідае жыхароў сам-насам са сваімі праблемамі. На змену стацыянарным крамам прыходзяць аўтакрамы «на колах».**

Напрыклад, дзесяць аўтамагазінаў Капыльскага райспажыўсаюза Мінскай вобласці па дваццаці маршрутах абслугоўваюць 153 населеныя пункты раёна.

СТАР. 4



# «Ахова здароўя будзе забяспечана неабходным для аказання медыцынскай дапамогі насельніцтву ў поўным аб'ёме»

*(Заканчэнне.
Пачатак на 1-й стар.)*

Ён дадаў, што так званая новая іспанка захоплівае Заходнюю Еўропу — таму не маглі пакідаць межы для ўезду ў краіну адкрытымі.

«Тым больш што пік у нас не пераадолены. ***Ніякай палітыкі тут няма. Рашэнне сур'ёзнае, носіць абмежавальны і часовы характар. Гэта часовае рашэнне,*** — сказаў Прэзідэнт. — Усе дзяржавы звяртаюцца да гэтых метадаў. Калі мы кажам, што межы ў нас зачынены для тых, хто спрабуе да нас уехаць з-за межаў, зразумела, з захаду (з Расіяй у нас няма межаў), гэта таму, што мы бачым вялізарны выбух захваральнасці».

Прэзідэнт паведаміў: два дні таму Польшча пачала па ўсім свеце збіраць медыцынскі персанал, каб аказваць дапамогу сваім людзям. «Асабліва просяць нашых урачоў прыехаць у Польшчу, каб дапамагчы насельніцтву і дзяржаве ў барацьбе з «ковідам». Хачу папярэдзіць: лішніх урачоў у нас няма. Нам самім неабходна лячыць сваіх людзей, але, згодна са сваім прынцыпам, мы нікога трымаць не будзем. Аднак трэба разумець: з'ехаў — назад не вернешся. Там будзеш працаваць і зарабляць тыя вялікія грошы, за якімі з'ехаў. Гэта не пагроза — гэта загад для ўрада», — заявіў Прэзідэнт.

У вяснова-летні перыяд на дзяржаўным узроўні былі своечасова прынятыя меры, якія разам з актыўнымі дзеяннямі сістэмы аховы здароўя далі чаканы станоўчы вынік, запэўніў кіраўнік краіны.

«Аднак сезонны перыяд росту вострых рэспіраторных захворванняў і каранавіруснай інфекцыі ў гэтым годзе прагназуецца больш доўгі. Нельга ігнараваць і дадатковы негатыўны ўплыў масавых мерапрыемстваў, з-за якіх крывая захворвання паўзе ўверх, — сказаў Аляксандр Лукашэнка. — Гэта не значыць, што мы, як было вясной у некаторых дзяржавах, усё зачынім, школы, універсітэты, аптэкі, бальніцы, увядзём каменданцкі час і перавядзём усіх на каранцін. ***Мы павінны ўспомніць тое, што было вясной і летам, і крочыць гэтым шляхам. А там, дзе мы можам абысціся без масавых мерапрыемстваў, давайце абыдземся».***

Прэзідэнт дадаў, што наша сістэма аховы здароўя мае ўсе запатрабаваныя рэсурсы — бальніцы, медыцынскі персанал, лекі, абсталяванне, сродкі індывідуальнай аховы.

«Урачоў у нас дастаткова кваліфікаваных. У часы Караніка (былы міністр аховы здароўя — **«Зв».**) у пачатку года мы навучыліся змагацца з гэтым злом, не маючы ні вопыту, ні лекаў, не разумеючы, як змагацца. Не хапае сярэдняга медыцынскага персаналу, як я сказаў, патроны падносіць — давайце задзейнічаем нашых студэнтаў, заплацім гэтым студэнтам», — прапанаваў кіраўнік краіны.

**Ігар СТОМА, рэктар Гомельскага дзяржаўнага медыцынскага ўніверсітэта,** паведаміў пра валанцёрскую дзейнасць студэнтаў-медыкаў у барацьбе з «ковідам».

«Вельмі важна разумець, што гэта ідзе ад студэнтаў, гэта не навязаная зверху ідэя. Маладыя людзі самі прыходзяць і задаюць пытанне, як мы можам дапамагчы ў час пандэміі нашай краіне? Сёння ў нас працуе валанцёрскі атрад, які вучыць людзей з COVID-19 зноў дыхаць. Гэта пытанні дыхальнай рэабілітацыі хворых», — расказаў рэктар.

Прэзідэнт запэўніў, што «ахова здароўя ў далейшым будзе забяспечана неабходным для аказання медыцынскай дапамогі насельніцтву ў поўным аб'ёме, фінансаванне галіны, як гэта было заўсёды, павінна быць устойлівае, прадуманае і арыентаванае на вынік».

Аляксандр Лукашэнка параіў максімальна выкарыстоўваць лічбавыя інфармацыйныя платформы для сувязі з медыцынскімі работнікамі ў рэгіёнах, каб атрымліваць усю інфармацыю аб праблемах, аператыўна прымаць меры, абменьвацца вопытам і найбольш эфектыўнымі практыкамі.

«Сёння прапануюцца таксама дадатковыя меры для стрымлівання эпідэміі, у тым ліку абмежавальныя. Мы заслухаем аргументы, і калі прыйшоў час недзе ўводзіць абмежаванні, то пойдзем на гэта, — заявіў Прэзідэнт. — Трэба камусьці каранцін, каменданцкі час за суткі будзе ўведзены, як некаторыя патрабавалі. Але ці трэба гэта? Адназначна не. Сёння беларускі вопыт на вуснах ва ўсіх разумных людзей у свеце».

У перыяд веснавой хвалі каранавіруса стаўка была зроблена на мясцовыя ўлады як на апорныя цэнтры прыняцця аператыўных рашэнняў.

«І гэта практыка даказала сваю эфектыўнасць. Сёння складваецца падобная сітуацыя, — канстатаваў кіраўнік дзяржавы. — Таму нам неабходна на працягу аднаго-двух дзён арганізаваць рэгіянальныя штабы. Лічу, што персанальную адказнасць за іх работу і вынікі павінны несці губернатары і мае памочнікі — інспектары ў абласцях. Дапамагаць ім будуць найлепшыя ўрачы-інфекцыяністы, прадстаўнікі медыцынскай навукі, іншыя спецыялісты».

За Брэсцкую і Гродзенскую вобласці будзе адказваць старшыня Гродзенскага аблвыканкама Уладзімір Каранік. Яму ў дапамогу — галоўны ўрач Брэсцкай абласной бальніцы Аляксандр Карпіцкі і рэктар ГрДМУ Алена Каратковa. За Віцебшчыну адказны — рэктар ВДМУ Анатоль Шчасны, загадчык кафедрай інфекцыйных хвароб ВДМУ Валерый Сямёнаў, галоўны ўрач Віцебскай абласной інфекцыйнай бальніцы Таццяна Кавалёва. У Гомельскай вобласці — рэктар ГДМУ Ігар Стома. У Магілёўскай — доктар медыцынскіх навук, член Савета Рэспублікі Алег Суконка і намеснік галоўнага ўрача Магілёўскай інфекцыйнай бальніцы Ірына Бас. У Мінскай — памочнік Прэзідэнта Аляксандр Косінец, галоўны дзяржаўны санітарны ўрач Беларусі Аляксандр Тарасенка, прафесар кафедры інфекцыйных хвароб БДМУ Дзмітрый Данілаў, галоўны ўрач Рэспубліканскага клінічнага медцэнтра Кіраўніцтва справамі Прэзідэнта Ірына Абельская. Наталля Качанава, старшыня Савета Рэспублікі і выконваючы абавязкі міністра аховы здароўя Дзмітрый Піневіч адказваюць за Мінск. Групу экспертаў, якія будуць кансультаваць усе рэгіёны, сфарміруе і ўзначаліць загадчык кафедры інфекцыйных захворванняў БДМУ Ігар Карпаў.

Ігар Карпаў расказаў журналістам, што на спецыялістаў з рэгіёнаў кладзецца вялікая адказнасць па наладжванні арганізацыі працэсу супрацьдзеяння і лячэння каранавіруса.

«Зараз большасць спецыялістаў уяўляе сабе гэту работу, але хачу акцэнтаваць увагу — важна, як гэта работа арганізавана на месцах. Дапамога павінна дастукацца да кожнага рэгіёна. Яна павінна быць максімальна стандартызавана. Гэтым займаліся ў мінулы раз, ездзілі па самых аддаленых ад Мінска рэгіёнах. Зараз гэта работа будзе працягнута», — сказаў спецыяліст.

Народны ўрач Беларусі зноў нагадаў пра асноўныя правілы бяспекі падчас распаўсюджвання інфекцый, якімі грамадзяне пагарджаюць.

«Першае, канешне, гэта дыстанцыяванне. Мы стараемся трымаць дыстанцыю 1,5 метра — гэта важна. Істотны аспект, які выйшаў на другое месца, — праветрыванне памяшкання, каб пазбавіцца ад дысперсных часціц, якія бываюць у паветры. Гэта рэальна зніжае магчымасць захворвання. Не трэба забываць пра гігіену рук, — пералічвае Ігар Карпаў. — І нарэшце, нашэнне масак. У цяперашні час з ростам захваральнасці гэта мэтазгодна. Трэба памятаць, што гэта ў значнай ступені — адказнасць перад іншымі людзьмі і перад сабой».

Прэзідэнт падкрэсліў: «Барацьба з хваробай павінна быць сістэмнай і праводзіцца на ўсіх франтах — лячэбным, арганізацыйным, эканамічным і нават палітычным».

Кіраўнік краіны даў загад, што ўсякае тэсціраванне павінна быць у лабараторыях, якія вызначыць Міністэрства аховы здароўя, асабліва гэта датычыцца Мінска.

«У нас некаторыя разумныя закупілі абсталяванне і сталі скуру драць з людзей. Псіхоз ствараюць у грамадстве, і яны бягуць у гэтыя лабараторыі і да 300 рублёў даходзіць адзін тэст. Калі хтосьці з прыватных лабараторый хоча дапамагчы дзяржаве, то на дзяржаўных умовах», — запатрабаваў Аляксандр Лукашэнка.

Ён звярнуў увагу на неабходнасць забеспячэння насельніцтва інфармацыяй.

«Забяспечце пастаянную сувязь з насельніцтвам праз сродкі масавай інфармацыі па эпідэмічнай сітуацыі ў краіне і прымаемых мерах. Адказвайце на пытанні, якія ўзнімаюць людзі на месцах, аж да прамых сустрэч з імі», — заклікаў Прэзідэнт.

Як заявіў Аляксандр Лукашэнка, тэмы, якія сёння абмяркоўваюць, застануцца ў прыярытэце да таго часу, пакуль небяспека не абміне. Або, прынамсі, не знізіцца да мінімальна прымальнага ўзроўню.

«Прашу без інсінуацый, без панікі. ***У нас няма прычын для панікі, абсалютна няма.*** Я часта кажу як чалавек, які перанёс гэтую хваробу, самае страшнае ў ёй — паніка і псіхоз, — выказаўся кіраўнік краіны. — ***Усім акажам неабходную дапамогу. Усе, каго магчыма выратаваць усімі магчымымі і немагчымымі метадамі, будуць выратаваны».***

**Марыя ДАДАЛКА.**



Фота БелТА.

**Учора на РУП «Медтэхнацэнтр» была ўведзена новая лінія па вытворчасці ахоўных масак, закупленая пры падтрымцы Міністэрства аховы здароўя.**

## ❍ У тэму

Пасля нарады на пытанні журналістаў адказаў **намеснік міністра аховы здароўя Барыс АНДРАСЮК.**

Як ён паведаміў, пра ніякія надзвычайныя і нечаканыя абмежаванні размова не ішла. Па словах Барыса Андрасюка, не плануюць працягваць і асеннія канікулы для школьнікаў: «Пакуль не плануецца, але гэта будзе вырашацца па меры развіцця эпідэміі».

Сярод асноўных даручэнняў кіраўніка краіны — праверыць спраўнасць і гатоўнасць абсталявання.

«Абсталяванне ў нас дастаткова. Гэта і апараты ШВЛ, і кіслародныя пункты. Іх колькасць нарасціла ўдвое з сакавіка. Акцэнтавалі ўвагу на кіслародную бяспеку», — расказаў намеснік міністра аховы здароўя.

Разглядаліся, па яго словах, клінічныя выпрабаванні расійскай вакцыны ад «ковіда». «Мы зараз адпрацоўваем з расійскім бокам пляцоўку. Мы практычна ўжо ўзгаднілі яе — гэта «Белмедпрэпараты». Цяпер ідзе адпрацоўка трансфера перадачы тэхналогіі. Што гэта будзе за тэхналогія, што гэта будзе за вакцына — размова ідзе непасрэдна паміж спецыялістамі», — паведаміў Барыс Андрасюк.

# «Мы зробім усё магчымае, каб абараніць і захаваць нашу Айчыну, заўтрашні дзень нашых дзяцей і ўнукаў»

## У Палацы Незалежнасці ўручылі дзяржузнагароды і пагоны афіцэрам

**Колькасць узнагароджаных была вялікая — 40 чалавек. З рук Прэзідэнта яны атрымалі пасведчанні «Заслужаны дзеяч навукі», «Заслужаны работнік сельскай гаспадаркі», «Заслужаны трэнер», «Заслужаны майстар спорту», «Заслужаны юрыст», «Заслужаны работнік сферы абслугоўвання», «Заслужаны спецыяліст Узброеных Сіл», ордэны Пашаны і ордэн «За службу Радзіме» III ступені. Чарговы класны чын дзяржаўнага саветніка юстыцыі 2-га класа прысвоены генеральнаму пракурору Андрэю Шведу, пагоны генералаў-лейтэнантаў атрымалі міністр абароны Віктар Хрэнін, старшыня КДБ Іван Тэртэль і старшыня Дзяржпагранкамітэта Анатоль Лапо.**

Аляксандр Лукашэнка пачаў сваю прамову з таго, што заўсёды з асаблівым пачуццём уваходзіць у залу, дзе адбываюцца такія цырымоніі. Уручэнне дзяржаўных узнагарод для Прэзідэнта, паводле яго слоў, не толькі цырымонія з глыбокім сэнсам — гэта факт грамадскага прызнання заслуг людзей, чыёй працай забяспечваецца штодзённае жыццё краіны, дэманстрацыя таго, як прафесіяналізм і працавітасць дазваляюць чалавеку дасягнуць значных вынікаў у любімай справе і рэалізаваць сябе ў нашай дзяржаве.

«Вы не проста паспяховыя людзі. Вы будаўнікі, якія ствараюць сучаснасць і будучыню краіны, будучыню новых пакаленняў беларусаў і для новых пакаленняў. Кожны разважлівы чалавек ведае, што толькі упартая, стваральная праца з'яўляецца крыніцай дабрабыту як асобнай сям'і, так і дзяржавы. Вашы прафесійныя дасягненні — яркае таму пацвярджэнне», — сказаў Прэзідэнт.

Большасць прысутных у зале — працаўнікі вёскі, кіраўнікі перадавых прадпрыемстваў агракомплексу, механізатары, аператары машыннага даення, работнікі жывёлагадоўчых комплексаў.

«Вы добра ведаеце, што лёгкі хлеб, малочныя рэкі і кісельныя берагі бываюць толькі ў казках. Бо сельская гаспадарка — гэта цэх пад адкрытым небам, дзе нават маленькі крок наперад у намаганнях, надоях і прыбаўленні — заўсёды вынік намаганняў соцень тысяч сельскіх працаўнікоў і работнікаў іншых сфер эканомікі. Усё тут аб'яднана і пераплецена, — дадаў Аляксандр Лукашэнка. — Нізкі паклон вам і ў вашай асобе — усім аграрыям, якія не спалохаліся каранавіруса, не паняліся на абяцанкі палітыканаў і засталіся вернымі свайму святому прызванню — карміць краіну і народ».

Узнагароды таксама чакалі навукоўцаў, ваенных, работнікаў сферы абслугоўвання, кіраўнікоў ветэранскіх арганізацый, трэнераў, спартсменаў.

Кіраўнік краіны падкрэсліў: «Сёння мы ўручаем новыя пагоны генералам, якія нагляднa паказалі, як трэба служыць Айчыне, калі яна ў небяспецы. Як трэба абараняць інтарэсы дзяржавы і свой народ. Бо сапраўдны патрыятызм у асноўным — гэта не словы, а справы, якія павышаюць якасць жыцця беларусаў і значна ўмацоўваюць нашу дзяржаву».

Прэзідэнт павіншаваў прысутных з надыходзячым святам Вялікага Кастрычніка, з заслужанымі ўзнагародамі і ганаровымі званнямі.

«Перакананы, што разам мы здолеем пераадолець цяжкасці, таму што мы народ і нас пераважная большасць. Мы ведаем, што рабіць, і зробім усё магчымае, каб абараніць і захаваць нашу Айчыну, заўтрашні дзень нашых дзяцей і ўнукаў», — падкрэсліў Прэзідэнт.

Ён заявіў: кажуць, што Беларусь перажывае цяжкі час, але ён ніколі не быў просты, асабліва для сялян.

«Няма дажджу, высушана зямля — дрэнна, дажджом залiла — таксама дрэнна. Заўсёды бывае складана, але любыя цяжкасці і праблемы — гэта магчымасці. Калі цяжка, трэба вытрымліваць, годна прайсці гэты шлях і атрымаць урокі», — сказаў Аляксандр Лукашэнка.

Кіраўнік краіны працягнуў, што «дрэнна, калі на ціхіх, утульных вуліцах нашых гарадоў, асабліва нашай сталіцы ў парушэнне закону і парадку выходзяць рознага кшталту людзі, але з гэтага трэба таксама атрымліваць урокі».

На яго думку, у кожнай падзеі ёсць два бакі: «Я сказаў, што гэта дрэнна. Але ў гэтым ёсць і нешта карыснае. Я ўжо казаў, нарэшце, тут у Мінску, прывыклыя да ўтульнасці, цеплыні, шыкоўных кватэр (у асноўным яны там, на вуліцах), тыя, хто зарабляе непамерна высокія грошы на нашых часах і нашай краіне, зразумелі, што могуць страціць. І людзі кажуць, што хочуць краіну, якая была да выбараў. Яна была такой, якой мы яе бачылі і хочам бачыць, яна застанецца такой, пакуль я Прэзідэнт».

Лідар яшчэ раз падзякаваў ваенным, аграрыям і іншым спецыялістам за працу.

«Толькі дзякуючы вам, вашай працы сёння існуе гэты кавалак зямлі ў цэнтры Еўропы, на які вока паклала шмат ахвотных намі пакіраваць. Мы самі здольныя кіраваць сабой, сваёй краінай і стварыць нармальныя ўмовы не толькі для нас з вамі, але і для сваіх дзяцей і ўнукаў. Іншай зямлі ў іх не будзе. Памятайце гэта. Я заўсёды кажу, мы не багата жывём, але як старэйшыя людзі кажуць, беларусы так ніколі не жылі. Давайце захаваем нашу краіну, а ўсе нашы багацці залежаць толькі ад нас», — рэзюмаваў Прэзідэнт.

**Марыя ДАДАЛКА.**

Анонс

# ПАЧУЦЬ УСІХ

**Менавіта такую задачу бачаць перад сабой заканадаўцы, юрысты, палітычныя і грамадскія дзеячы, якія бяруць удзел у шырокім грамадскім абмеркаванні магчымых змяненняў у Канстытуцыю Беларусі.**

2 кастрычніка ў парламенце распачаўся збор прапаноў па змяненні Канстытуцыі. Пазней да шырокага грамадскага абмеркавання падключыліся дыялогавыя пляцоўкі па ўсёй краіне. Пра тое, што прапануюць людзі і ў што ўсё гэта павінна выліцца, ішла размова падчас круглага стала ў рэдакцыі «Звязды».

«На канец кастрычніка колькасць прапаноў налічвала тысячы, — расказаў **намеснік старшыні Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў па дзяржаўным будаўніцтве, мясцовым самакіраванні і рэгламенце Віктар СВІЛА**. — Людзі, якія ўносяць гэтыя прапановы, не абавязаныя быць юрыстамі. Яны выказваюць свае пажаданні, меркаванні. Ёсць два варыянты распарадзіцца гэтым. Мы ў Палаце прадстаўнікоў вырашылі, што ўсе прапановы, якія не датычацца Канстытуцыі, будуць размеркаваныя па нашых профільных камісіях у якасці сыравіны для далейшай работы над канкрэтнымі законапраектамі».

Большая частка выказаных ідэй будзе рэалізаваная, не сумняваецца **дацэнт кафедры канстытуцыйнага права юрыдычнага факультэта Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта Ала ШАЎЦОВА**: «Калі не на ўзроўні Канстытуцыі, то на ўзроўні Грамадзянскага, Падатковага кодэксаў, Кодэксу аб шлюбе і сям'і і іншых нарматыўных прававых актаў, што з'яўляюцца фундаментам сацыяльных, эканамічных каштоўнасцяў. Грамадзяне будуць пачуты — гэта пытанне часу. Ён неабходны, каб заканадаўчы орган змог прапрацаваць прапановы і выйсці на ўзровень унясення змяненняў і дапаўненняў у прававыя акты».

**Сенатар Віктар ЧАЙЧЫЦ** згодны, што ў Канстытуцыі ўсяго не прапішаш, але зараз любыя выказванні грамадзян важныя для дзяржавы і грамадства, падкрэслівае ён. Тым не менш ёсць пытанні, якія можна вырашыць толькі праз унясенне пэўных змяненняў у Асноўны закон. Гэта датычыцца паўнамоцтваў і статусу Канстытуцыйнага суда, суда прысяжных, партыйнага будаўніцтва, пераразмеркавання паўнамоцтваў паміж рознымі галінамі ўлады.



Усе гэтыя пытанні патрабуюць як усенароднага абмеркавання, так і дасканалай работы спецыялістаў. «Накідаць тэзісы на дыялогавай пляцоўцы проста, але тэхнічна забяспечыць іх рэалізацыю вельмі складана», — заўважыў **галоўны ўрач 1-й гарадской клінічнай бальніцы горада Мінска, дэпутат Палаты прадстаўнікоў пятага і шостага скліканняў Дзмітрый ШАЎЦОЎ**. Ён прывёў прыклад прапарцыянальнай выбарчай сістэмы, якая запатрабуе альбо павелічэння колькасці дэпутатаў, альбо змяншэння колькасці выбарчых акруг.

Поўную тэкставую версію гутаркі чытайце ў найбліжэйшых нумарах «Звязды».

**Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА.**

Надвор'е

# ПАСЛЯ СВЯТ ВОЗЬМЕ І ПАХАЛАДАЕ

## На наступным тыдні ўначы замаразкі

**А пакуль у нас надвор'е, якое звычайна бывае ў апошні тыдзень верасня. Вось і цяпер атлантычныя цыклоны бесперапынным ланцужком ссоўваюцца ва ўсходнім напрамку, перакрываючы доступ арктычнаму паветру ў паўднёвыя шыроты Еўропы. І атрымліваецца, што тэмпературны рэжым адстае ад календара амаль на месяц. Але з панядзелка да нас ідзе скандынаўскі холад, паведамляюць спецыялісты Рэспубліканскага цэнтра па гідраметэаралогіі, кантролі радыеактыўнага забруджвання і маніторынгу навакольнага асяроддзя Мінпрыроды.**

7 лістапада захаваецца ўплыў вобласці павышанага атмасфернага ціску, якая сфарміруецца ў цёплай паветранай масе. Будзе воблачна з праясненнямі і пераважна без ападкаў. Уначы і раніцай месцамі туманы, вецер прагназуецца заходні ўмераны, па паўночным усходзе парывісты. Тэмпература паветра ўначы складзе ад плюс 4 да 9 градусаў цяпла, удзень — ад плюс 8 да 13 градусаў вышэй за нуль.

У нядзелю наша краіна па-ранейшаму будзе знаходзіцца пад уплывам цёплай паветранай масы і павышанага атмасфернага ціску. У многіх раёнах абыдзецца без ападкаў, толькі раніцай і ўдзень па паўночным усходзе краіны магчымыя невялікія кароткачасовыя дажджы. У асобных раёнах краіны будуць згушчацца туманы. Вецер прагназуецца заходні ўмераны, па паўночным усходзе парывісты. Тэмпература паветра ўначы складзе 3—9 цяпла, удзень будзе ад плюс 7 да 12 градусаў.

Паводле папярэдніх прагнозаў айчынных сіноптыкаў, на наступным тыдні сітуацыя з надвор'ем пачне змяняцца. На месца цёплых цыклонаў да нас прыйдзе халодны скандынаўскі антыцыклон. Тэмпература з кожным днём будзе паніжацца і паступова наблізіцца да звыклых паказчыкаў лістапада. У панядзелак будзе пераважна без ападкаў, толькі ў асобных раёнах па паўночным усходзе Беларусі пройдуць невялікія дажджы. Месцамі чакаецца туман. Пахаладанне мы адчуем бліжэй да ночы. Тэмпература паветра ўначы складзе ад нуля да плюс 7 градусаў, ды і ўдзень будзе золка — ад плюс 4 да 11 градусаў цяпла.

У аўторак антыцыклон возьме надвор'е ў свае халодныя рукі. Будзе пераважна без ападкаў, толькі ў асобных раёнах па паўночным усходзе краіны магчымы невялікія ападкі, у асноўным дождж, магчымы і мокры снег. Уначы і раніцай месцамі чакаецца туман. Тэмпература паветра ўначы складзе ад мінус 2 да плюс 4 градусаў, па паўднёвым захадзе — да плюс 6. Удзень будзе 3—8 цяпла. Нічога асаблівага, лістапад на двары.

**Сяргей КУРКАЧ.**

# ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

### У Даніі знішчаць усіх норак



Улады Даніі вырашылі знішчыць да 17 мільёнаў норак на 1139 фермах краіны, паколькі ў жывёл выявілі мутацыю каранавіруса SARS-CoV-2, здольную перадавацца чалавеку, паведаміла BBC News. Пра гэта абвясціла прэм'ер-міністр Мэтэ Фрэдэрыксен. Прэм'ер назвала сітуацыю «вельмі, вельмі сур'ёзнай». Паводле яе слоў, ва ўрада ёсць вялікая адказнасць перад уласным народам, але з улікам выяўленай мутацыі ў яго ўзнікае «яшчэ большая адказнасць перад усім светам». Данія — найбуйнейшы ў Еўропе вытворца футра норак. Міністр па пытаннях харчавання і рыбалоўства Могенс Енсен паабяцала фермерам дапамогу ад дзяржавы, перадае Deutsche Welle. На пакрыццё страт уладам прыйдзецца выдаткаваць да 440 мільёнаў долараў. Каранавірус выявілі ўжо больш чым на 200 фермах краіны, на 67 з іх усіх жывёл ужо знішчылі. На знішчэнне норак, акрамя нацыянальнага агенцтва па надзвычайных сітуацыях, будуць кінутыя ў тым ліку і дацкія ўзброеныя сілы.

### У эфіопскім штаце Тыграй уведзена надзвычайнае становішча

Федэральны ўрад Эфіопіі абвясціў надзвычайнае становішча ў паўночным штаце тэрмінам на шэсць месяцаў у сувязі з нападамі баевікоў з Народнага фронту вызвалення Тыграй на ваенныя аб'екты. Пра гэта паведаміла эфіопская радыёстанцыя Fana са спасылкай на канцылярыю прэм'ер-міністра Эфіопіі Абія Ахмеда. Кіраўнік урада выступіў па нацыянальным тэлебачанні і паведаміў, што аддаў загад сілам нацыянальнай абароны Эфіопіі выканаць у штаце Тыграй місію па выратаванні краіны і рэгіёна ад нарастаючай нестабільнасці. Як вядома, Федэратыўная Дэмакратычная Рэспубліка Эфіопія складаецца з дзевяці штатаў, або рэгіёнаў, утвораных на этнічнай аснове, і двух мегаполісаў — Адыс-Абеба і Дырэ-Даўа. Рэгіёны карыстаюцца шырокай аўтаноміяй, у тым ліку ў такіх сферах, як пытанні бяспекі, падатковая палітыка і выкарыстанне зямельных рэсурсаў.

### Налета пачнуцца падводныя экскурсіі на «Тытанік»

Амерыканскі бізнесмен плануе праводзіць турыстычныя экспедыцыі на «Тытанік» з мая наступнага года. Па словах дырэктара кампаніі OceanGate Expeditions Стоктана Раша, ён расшлічвае кожны год з мая да верасня штотыдзень арганізоўваць апусканні да патанулага судна. Для гэтага будзе выкарыстана прыватная падводная лодка, у якую могуць змясціцца да пяці чалавек. У кожным туры могуць прымаць удзел пяць чалавек: капітан падлодкі, вучоны-даследчык і тры турысты. Як чакаецца, да месца апускання яны будуць дабірацца ад канадскага вострава Ньюфаўндленд. Яны будуць апускацца на глыбіню 3,8 кіламетра, падводная частка экспедыцыі складзе ад шасці да васьмі гадзін. Раш расказаў, што на экспедыцыі з мая да ліпеня 2021-га частка месцаў ужо зарэзервавана.

Аднаўленне

# УСЁ — ДЛЯ КАМФОРТУ

## У Пружанах адкрылі стаматалагічную паліклініку пасля капітальнага рамонту

**Доўгачаканы сацыяльны аб'ект расчыніў дзверы для наведвальнікаў у Пружанах, што на Брэстчыне. Тут урачыста адкрылі стаматалагічную паліклініку, рамонт у якой працягваўся з вясны 2018 года. Ажыццяўленне праекта абышлося абласному і раённаму бюджэтам у 1 мільён 400 тысяч рублёў, з якіх 300 тысяч пайшло на закупку абсталявання.**


Фота з сайта газеты «Раённыя будні».

Падчас рамонту ў будынку заменены канструкцыйныя элементы, праведзена перапланіроўка і цеплавая рэабілітацыя, прызначэнне асобных памяшканняў памянялася на карысць працэсу аказання дапамогі. Для людзей з абмежаванымі магчымасцямі з'явілася безбар'ернае асяроддзе.

Змянілася не толькі памяшканне лячэбнай установы. На тэрыторыі праведзена добраўпарадкаванне, зроблена стаянка для аўтатранспарту.

Варта адзначыць, што ў строй здадзена толькі першая чарга аб'екта. У ходзе другой чаргі прадугледжана дааснашчэнне іншых памяшканняў, напрыклад, рэнтгеналагічнага кабінета з тым, каб абсталяваць яго лічбавым апаратам.

Паводле слоў **загадчыка паліклінікі Паўла КРАЧКО,** зараз установа аховы здароўя можа прымаць да 170 пацыентаў з горада і раёна за змену.

**Святлана ЯСКЕВІЧ.**

Прыемная навіна

# ЯШЧЭ АДЗІН АГРАГАРАДОК ГАЗІФІКАВАНЫ НА МІНШЧЫНЕ

**«Блакітнае паліва» прыйшло ў аграгарадок Залужжа Старадарожскага раёна. Гэтай падзеі даўно чакалі мясцовыя жыхары.**

Дасюль яны ацяплялі свае дамы торфабрыкетам, дровамі. А гэта — дадатковыя клопаты: нарыхтаваць паліва, прывезці, разгрузіць, складзіраваць у гаспадарчым памяшканні. А раніцай прынесці ў хату, каб распаліць печку. Не вельмі прыемны занятак. А цяпер мы будзем жыць, як у горадзе, не нарадуюцца тутэйшыя людзі, у пастаянным цяпле, камфорце. Многія з іх прыйшлі на ўрачыстае адкрыццё аб'екта, каб падзякаваць мясцовым уладам, газавікам за клопат.

Работы вяліся ў два этапы. З сакавіка да мая да аграгарадка было пракладзена амаль восем з паловай тысяч метраў поліэтыленавага газапровода высокага ціску. На будаўніцтве асвоена 1 178 888 рублёў бюджэтных сродкаў па дзяржаўнай праграме «Камфортнае жыллё і спрыяльнае асяроддзе».

З ліпеня да кастрычніка падведзена больш за сем з паловай метраў поліэтыленавага газапровода сярэдняга ціску з уводамі да 46 жылых дамоў. Кошт газапровода сярэдняга ціску склаў 324 679 рублёў, у тым ліку 227 275 рублёў — бюджэтныя сродкі.

Ва ўрачыстай цырымоніі адкрыцця аб'екта прынялі ўдзел старшыня пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Алег Белаконеў, генеральны дырэктар унітарнага прадпрыемства «Мінскаблгаз» Юрый Кукліцкі, старшыня Старадарожскага райвыканкама Мікалай Карловіч.

Дарэчы, у Старадарожскім раёне зарэгістравана пятнаццаць спажывецкіх кааператываў па газіфікацыі. Яна праводзіцца ў адпаведнасці з Указам Прэзідэнта № 368 «Аб мерах па рэгуляванні адносін пры газіфікацыі прыродным газам эксплуатуемага жыллёвага фонду грамадзян».

**Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ.**

Святочнае

# БУДЗЕ ДЗЕ АДПАЧЫЦЬ І ПАСПАБОРНІЧАЦЬ

**У Магілёўскай вобласці працягваецца адкрыццё розных аб'ектаў, прымеркаваных да святкавання Дня Кастрычніцкай рэвалюцыі. Учора першых гульцоў прынялі дзве новыя міні-футбольныя пляцоўкі — у клімавіцкай сярэдняй школе № 3 па вуліцы Камуністычнай і ў Крычаве — на базе раённай спецыялізаванай дзіцяча-юнацкай школы алімпійскага рэзерву.**

Гэтыя два тыпавыя спартыўныя аб'екты памерамі 20 на 40 метраў з штучным пакрыццём, агароджай і ўбудаванымі варотамі з'явіліся дзякуючы падтрымцы Беларускай федэрацыі футбола і Тураўскага малочнага камбіната.

А старт святочным адкрыццям даў увод у дзеянне пасля капрамонту плавальнага басейна ў школе аграгарадка Аўсянка, што ў Горацкім раёне. Ім цяпер могуць карыстацца дзеці і дарослыя не толькі гэтага раёна, але яшчэ і Шклоўскага. Тут жа плануецца праводзіць спартыўна-масавыя і аздараўленчыя мерапрыемствы. Падчас рамонту будаўнікі памянялі пакрыццё гідратэхнічнага збудавання, узмацнілі падмурак будынка, абнавілі водаправодныя і каналізацыйныя інжынерныя сеткі. Да паслуг наведвальнікаў падлогі з падагрэвам, сучасныя душавыя кабіны і зручныя раздзявальні. Басейн знаходзіўся на рамонце каля двух гадоў, і для жыхароў аграгарадка і іх дзяцей адкрыццё стала доўгачаканай падзеяй.

— Гэта вельмі вялікі падарунак ад Прэзідэнта звычайнаму аграгарадку, — адзначыў падчас адкрыцця **старшыня Магілёўскага аблвыканкама Леанід ЗАЯЦ.** — Будаўнікі папрацавалі на якасць. У аб'ект укладзена шмат сродкаў, але гэта той выпадак, калі выдаткі апраўданыя. Жыхары атрымалі добрую магчымасць заняцца спортам і фізкультурай.

**Нэлі ЗІГУЛЯ.**

# Абслугоўванне на колах

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Разам з кіроўцам Віктарам Чэчыкавым і прадаўцом Вольгай Карпленяй мы загружаемся спачатку на складзе ў Капылі, затым у Цімкавічах рознымі прадуктамі. Дружны тандэм абслугоўвае 19 населеных пунктаў з колькасцю насельніцтва 474 чалавекі. Сёння экіпаж наведае дзевяць вёсак.

— Выбар прадукцыі на складах вельмі шырокі, як малочнай, так і каўбаснай. Яе завозяць не толькі ад вытворцаў Мінскай вобласці, але і з іншых рэгіёнаў краіны. Вялікім попытам карыстаюцца і прадукты мясцовай вытворчасці, якія выпускае ўнітарнае прадпрыемства «Капыльскі кааппрам», кандытарскія цэхі райспажыўсаюза, — кажа прадавец і адначасова спрытна выкладае тавар на вітрыну. Трэба, каб было ўсё прыгожа, акуратна, каб пакупнік ацаніў, што да яго ставяцца з павагай.

— Мы неабыякавыя да патрэб нашых пакупнікоў. Вывучаем, аналізуем попыт, кошт прадуктаў харчавання. Глядзім, напрыклад, каб яны былі натуральныя, а цэны — прымальныя, — кажа **начальнік участка Капыльскага райспажыўсаюза Марына КНЫШЭВІЧ.**

Разам з Марынай Сяргееўнай мы накіроўваемся ўслед за аўтакрамай. Першы населены пункт, праз які пралягае маршрут, — вёска Дзяржына, дзе пражывае 74 чалавекі. Тут машына робіць пяць супынкаў. Людзі ведаюць, калі чакаць аўтакраму, бо кожная «стаянка» абсталявана спецыяльнай таблічкай з інфармацыяй: хто абслугоўвае маршрут, калі прыйдзе машына, куды можна патэлефанаваць, каб зрабіць папярэдні заказ на закуп усіх відаў другаснай сыравіны, дзікаросляй і сельскагаспадарчай прадукцыі.




— І такія звесткі размешчаны ў месцах, дзе спыняюцца нашы аўтакрамы, ва ўсіх населеных пунктах, — дадае Марына Сяргееўна.

— Да нас аўтакрама прыходзіць два разы на тыдзень. Гэтага дастаткова. Людзей у нас мала засталося, старых забіраюць дзеці на зіму ў горад, — выказвае меркаванне Дзмітрый Турбан, жыхар вёскі Дзяржына. — Я, напрыклад, куплю малако, смятану, сыры, каўбасы. Бульба ды агародніна свая. Жонка — інвалід, я перанёс аперацыю на сэрцы, так што хатнюю гаспадарку давялося згарнуць, трымаем толькі курэй. Ды і навошта дадатковыя клопаты на старасці гадоў, калі ўсё неабходнае даставіць райспажыўсаюз.

Марыя Працко выкарыстоўвае бацькоўскі дом пад дачу.

— Дзеці адправілі мяне з горада на прыроду, далей ад каранавіруса. Маўляў, мама, у тваім узросце нельга рызыкаваць здароўем, — смяецца Марыя Аляксандраўна. — Для мяне гэта і лепш, свежае паветра, цішыня. А што датычыцца прадуктаў харчавання, то тут праблем няма. Усё неабходнае куплю ў аўтакраме. Адной мне трэба нямнога. А летам, калі прыязджаюць унукі, то пакупкі падвойваюцца. Заказваю малым і марожанае, і розныя ласункі — вядома ж, дзеці. Я вельмі задаволеная абслугоўваннем — вельмі ветлівая ў нас прадавец, прывозіць заўсёды толькі самыя свежыя прадукты. Ніколі не было такога, каб яны былі пратэрмінаваныя. Акрамя таго, машына прыходзіць у азначаны час, не даводзіцца чакаць.

— Так, мы стараемся вытрымліваць графік, — канстатуе Вольга Карпленя. — І жыхары нас не падводзяць, збіраюцца своечасова.

— Вольга Мікалаеўна, цяжка працаваць, стамляецеся? Гэта ж не жартачкі абслужыць за дзень столькі пакупнікоў? — цікаўлюся ў сваёй суразмоўніцы. — І пры гэтым быць ветлівай, вытрыманай, усміхацца. А яшчэ ж трэба і план выконваць.

— Так, мне штомесяц даводзіцца план. Напрыклад, у кастрычніку ён быў 33 тысячы 400 рублёў. Прадала тавараў амаль на 36 тысяч. Што датычыцца напружанай працы, то за столькі гадоў да яе прывыкла. На першым плане для мяне, каб пакупнікі былі задаволеныя.

Віктар Чэчыкаў водзіць аўтакраму ўжо шэсць гадоў.

— Вы даязджаеце да самых аддаленых ад бойкіх шляхоў вёсак. А што, калі дарогу размые дажджом або замяце снегам?

— Усё роўна прабіваемся наперад. Просім, каб выцягнулі трактарам, тэлефануем старшыні сельсавета, каб прыслала снегаачышчальную тэхніку. Людзі ж не могуць заставацца без прадуктаў харчавання, — адказвае Віктар Іванавіч.

На наступным супынку нас чакае ўжо некалькі чалавек... і некалькі катоў.

— Яны адчуваюць, калі прыходзіць машына і выходзяць разам з намі, труцца каля ног, заглядваюць у вочы, чакаюць пачастункаў, — смяюцца гаспадары «мурак» ды «барсікаў». — І ім нешта купляем.

— А што для сябе выбіраеце? Кожны на свой густ, хтосьці бярозаўскую каўбасу, а нехта слонімскую. І пад заказ прывязуць прадукты. Сёння замовіш, а наступным разам прывязуць, — кажа Соф'я Фісько. — Мы нікому не аддадзім гэтую машыну. Яна новая, з нізкай вітрынай, што вельмі зручна і для старых, і для інвалідаў. Прадаўца і кіроўцу таксама не зменім. Яны выключныя людзі. Калі майго старога дома няма, то Віктар Іванавіч прынясе сумку з пакупкамі да хаты. І ездзіць па пакупкі нікуды не трэба. А вясной нам і насенне прывязуць — морквы, буракоў, капусты, — хто што закажа.

— Для паляпшэння абслугоўвання вясной і летам перагледзяюцца графікі работы аўтамагазінаў. Пры складанні маршрутаў улічваецца прыток насельніцтва, пажаданні жыхароў. Маршруты распрацоўваюцца так, каб максімальна ахапіць жыхароў вёсак і пасёлкаў, прыезджых, дзе адсутнічае стацыянарная сетка, а таксама — на аддаленых ад магазінаў вуліцах буйных населеных пунктаў. Напрыклад, у вёсцы Бучаціна ёсць крама, але старыя, нямоглыя людзі не могуць туды дайсці. Таму тут робім два прыпынкі. У адной з вёсак у мужчыны няма абедзвюх ног. Прадавец сам заходзіць да яго ў дом, аддае тавар і цікавіцца, што яму патрэбна наступным разам, — адзначае Марына Кнышэвіч.

— Тэхніка ёсць тэхніка. Часам здараюцца і непрадбачаныя абставіны, паломкі. Што робіце ў такім разе?

— Для таго каб не дапусціць зрываў, затрымак па маршруце, у райспажыўсаюзе ёсць два дадатковыя аўтамагазіны, аснашчаныя ўсім неабходным абсталяваннем, а таксама прадугледжана дадатковая загрузка аўтамабіляў у буйных гандлёвых аб'ектах — магазінах «Ластаўка», «Івушка». Акрамя таго, перад выездам на маршрут штодня стан тэхнікі правяраецца адказным спецыялістам, — тлумачыць Марына Кнышэвіч.

Тым часам наш аўтамабіль бяжыць па дарозе хутка і спраўна. І мы, праехаўшы восем вёсак, дасягаем самай крайняй — Старыны. Тут жывуць 34 чалавекі, якія чакаюць нас на пяці прыпынках.

— Нам прывозіць прадукты і індывідуальны прадпрымальнік. Але ў яго не такі разнастайны выбар. Звычайна прапаноўвае тавар якога-небудзь аднаго вытворцы. А нам на старасці гадоў хочацца паласавацца і рыбкай, і каўбасой, і смачнай выпечкай ды марожаным,— кажуць яны. З поўнымі сумкамі прысмакаў задаволеныя пакупнікі разышліся па дамах, пры гэтым пажадаўшы прадаўцу і кіроўцу добрага дня. Хоць гэта ўжо быў надвячорак — на вуліцы цямнела.

А заўтра дружны тандэм з самай раніцы зноў загрузіць машыну прадуктамі і ў дарогу.

**Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ.**

# БЫКАЎ, ШАМЯКІН, КАРАТКЕВІЧ І... ЭМОДЗІ

## Нестандартныя падыходы да развіцця ў вучняў эмпатыі, каманднага духу і вобразнага мыслення...

**«Яшчэ ўчора ў нас былі добрыя адносіны з Германіяй, бо мы ж суседзі, дацкая і нямецкая мова вельмі падобныя. А сёння немцы маршыруюць па вуліцах нашага горада, іх можна ўбачыць з вакна, бо кароль аддаў загад не аказваць супраціўленне нацыстам. Ён хоча выратаваць нашы жыцці».**

**«Мой бацька працаваў у паліцыі і за гэта яго схапілі і адправілі ў Сібір. Нас выселілі з кватэры, цяпер мы жывём у вёсцы ў сваякоў, недалёка ад Юрмалы. Матуля сказала, што мы з сястрой ужо дарослыя і зможам нейкі час пажыць у сваякоў, а потым яна і тата вернуцца».**

**«Зусім нядаўна мы жылі шчасліва, усё здавалася такім бязвоблачным, а зараз я сяджу ў лагеры для малалетніх злачынцаў. Мяне пасадзілі, таму што мой тата быў членам гарадскога савета Таліна. Яго арыштавалі адразу, як Савецкі Саюз захапіў Эстонію. Я не ведаю, дзе ён. Мне вельмі дрэнна».**

**«Нацысты запоўнілі парыжскія вуліцы. Яны фатаграфуюцца на фоне Эйфелевай вежы. Усюды паразвешвалі свае сцягі са свастыкай...»**

**Пра Другую сусветную вайну знята шмат дакументальных і мастацкіх фільмаў. Запісана мноства ўспамінаў сведкаў тых падзей. Але ў школьнай праграме ў падручніку для 10-га класа па гэтай тэме прыводзіцца мноства назваў, лічбаў, імен і падзей, за якімі ўбачыць і адчуць самую бязлітасную вайну ў гісторыі чалавецтва даволі праблематычна. І зусім немагчыма разабрацца ў яе першапрычынах.**

**Настаўнік гісторыі з Крычаўскай сярэдняй школы № 1 Андрэй КУЗЬМІН вырашыў зрабіць стаўку на эмоцыі і пачуцці школьнікаў. Падчас свайго майстар-класа на EdCamp Belarus — 2020, прысвечанага «пачуццёвым метадам» выкладання свайго прадмета, ён расказаў калегам, як яму ўдаецца зачапіць вучняў тэмай на ўроку і прымусіць прапусціць яе праз сябе.**



**Андрэй КУЗЬМІН: «Трэба прымусіць дзяцей паплакаць, калі не вонкава, то хоць бы ўнутрана».**

### ЗА СУХІМІ РАДКАМІ ПАРАГРАФА

— Выкладаць гісторыю ў школе ўвогуле вельмі цяжка, праблем — мільён, і адна з іх — недасканаласць падручнікаў, — разважае педагог. — Па іх ёсць пытанні з пункту гледжання і логікі, і захавання гістарычнай праўды. Ёсць таксама пытанні да методыкі і паслядоўнасці выкладання матэрыялу — ды, шчыра кажучы, яны папросту нецікавыя. І як жа нам дастукацца да дзяцей? Канешне, праз іх пачуцці. Напрыклад, перад пачаткам вывучэння Другой сусветнай вайны я прапаную дзецям паглядзець відэаролік, прысвечаны сумеснаму параду нямецкіх і савецкіх войскаў у Брэсце 22 верасня 1939 года. Гэта ключ да падзей, што адбываліся ў той час у Польшчы і што будуць адбывацца пазней. Затым увесь клас дзеліцца на дзве часткі: на краіны, якія былі акупаваныя фашысцкай Германіяй, і краіны, якія знаходзіліся пад Савецкім Саюзам. Вучні разбіраюць ролікі сваіх аднагодкаў з гэтых краін, якія я рыхтую ім загадздя. Кожны можа паставіць сябе на месца свайго равесніка і паспрабаваць адчуць тое, што адчувалі яны: страх, роспач, бездапаможнасць, горыч страт.

Ёсць такі сумны жарт. «Ці ведаеце вы, што такое Халакост? Ведаю, гэта такі шпалерны клей...» Дык вось, каб у рэальнасці вашы вучні не блыталі Халакост са шпалерным клеем, трэба пры вывучэнні гэтай тэмы прымусіць іх паплакаць, калі не вонкава, то хоць бы ўнутрана. Яна вельмі няпростая для сучасных дзяцей, бо размова ідзе пра падзеі амаль 80-гадовай даўнасці. І трэба дастукацца да іх душы.

Тое ж трэба зрабіць і пры вывучэнні падзей Грамадзянскай вайны ў Савецкай Расіі і сталінскіх рэпрэсій. Вельмі важна, якія відэаролікі і фотадакументы вы ім прапануеце. Хачу папярэдзіць, што да іх падбору трэба ставіцца вельмі асцярожна, памятаючы, што перад вамі ўсё ж такі дзеці. Неабходна знайсці нейкую «залатую сярэдзіну», каб не нашкодзіць іх псіхіцы. Відэа можа быць і дакументальнае, і мастацкае, кожны педагог сам вырашае, дзе знаходзіцца тая самая «залатая сярэдзіна». Але вучні павінны пагрузіцца ва ўнутраны свет і эмацыянальны стан іншага чалавека (гэта спрыяе развіццю ў іх эмпатыі), бо за сухімі радкамі з параграфаў школьнага падручніка стаяць жывыя людзі са зламанымі лёсамі.

Пры разглядзе некаторых тэм я выкарыстоўваю так званы тэатр на ўроку. Важна ўсё: позіркі, міміка, жэсты, паўзы... Адным словам, мы разам з вучнямі паглыбляемся ў кантэкст падзей шматгадовай даўнасці.

### НЕ БАЯЦЦА ВЫХОДЗІЦЬ ЗА РАМКІ

«Усё не тое, чым здаецца, або Як стварыць каманду з дапамогай кнігі без слоў» — так называўся майстар-клас **настаўніцы англійскай мовы сярэдняй школы № 1 з Пастаў Іны ПЛЕШАВЕНІ.** На кірмашы педагагічных ідэй EdCamp Belarus — 2020 педагог паабяцала пагаварыць пра такія важныя кампетэнцыі XXI стагоддзя, як уменне камунікаваць, працаваць у камандзе і выходзіць за межы рамак, у якіх мы знаходзімся. Праблема камандаўтварэння аказалася блізкая вельмі многім удзельнікам педагагічнай неканферэнцыі...



**Іна ПЛЕШАВЕНЯ: «Комікс «ZOOM» можа быць карысны і для медыяадукацыі, і для сторытэлінгу».**

— Год таму я даведалася ад калегі з Грэцыі пра існаванне надзвычай цікавай кнігі «Zoom» амерыканскага мастака-ілюстратара венгерскага паходжання Іштвана Баны. У ёй няма ніводнага слова, яна складаецца з 31 ілюстрацыі. Выданнем The New York Times «Zoom» яна была ўключана у топ найлепшых кніг года. Пазней яе выдалі ў 18 краінах свету, — расказала Іна Плешавеня. — Размова ідзе пра комікс, у якім кожны наступны фрэйм уключае ў сябе папярэдні, такім чынам глядач увесь час адсоўваецца ад першапачатковай сцэны, і толькі ў канцы разумее, што максімальны «зум» (павелічэнне) быў у самым пачатку.

Але прычым тут камандаўтварэнне? Малюнкі ў кнізе пададзены матрошкай, разам яны складаюць адзіны сюжэт (адбываецца быццам бы павелічэнне «зума»), вось толькі ўдзельнікі практыкавання гэтага не ведаюць. Настаўнікі, падзеленыя на групы, атрымалі па адной старонцы (адным малюнку) з ілюстраванай кнігі (кожная ўтрымлівае пэўную інфармацыю). Задачай групы было выкласці іх у лагічнай кніжнай паслядоўнасці, не паказваючы карцінкі адно аднаму, а толькі распавядаючы, што на іх намалявана. Можна было выкарыстоўваць таксама міміку і жэсты, спрабуючы знайсці ў групе малюнак, які папярэднічае твайму ў кнізе, і малюнак, які размяшчаецца ўслед за ім.

На завяршэнне Іна Плешавеня пацікавілася ў калег: «З якімі цяжкасцямі вы сутыкнуліся пры выкананні задання? Якія спасабы ўзаемадзеяння выкарыстоўвалі ў камандзе? Ці ўсе былі згодныя з парадкам размяшчэння карцінак? А ці ўсе прыслухоўваліся да меркавання іншых? Ці быў лідар у камандзе і людзі, якія стаялі збоку? Лідар узяў на сябе адказнасць?»

Насамрэч, гэтае практыкаванне выкарыстоўваецца для тымбілдынгу і дапамагае сфарміраваць з групы калектыў аднадумцаў, наладзіць паміж імі ўзаемадзеянне з мэтай вырашэння агульнай задачы. Акрамя таго, яно дае магчымасць патэнцыяльным лідарам праявіць свае здольнасці і ўзяць пад свой кантроль працэс вырашэння такой задачы. У выніку ўдзельнікі з дапамогай логікі збіраюць прыгожую і яркую гісторыю сусветнага маштабу.

Іна Плешавеня выкарыстоўвае кнігу Іштвана Баны для аб'яднання класнага калектыву і папярэджання булінгу, але бачыць у ёй значна большы патэнцыял. З яе дапамогай можна развіваць не толькі нестандартнае мысленне, камунікатыўныя навыкі і камандны дух. Яна можа быць карысная для медыяадукацыі, выкарыстоўвацца для сторытэлінгу.

— А яшчэ можна ўключыць крэатыў і самім прыдумаць кнігу па такім жа прынцыпе, — прапануе яна. — Галоўнае — не баяцца выходзіць за ўмоўныя рамкі...

### НА МОВЕ МАЛЮНКАЎ

Вучыць пакаленне візуалаў — задача няпростая. Паспрабуйце завалодаць іх увагай. Вучні не будуць слухаць доўга маналог настаўніка. Нельга прыйсці ў клас, штосьці расказаць, а потым патрабаваць, каб дзеці гэтую інфармацыю за вамі паўтарылі. Ранейшыя педагагічныя прыёмы ўжо не працуюць. **Настаўніца беларускай мовы і літаратуры з дзяржаўнай гімназіі № 1 г. п. Зэльва Наталля СТУПЧЫК** выкарыстоўвае на сваіх уроках эмодзі і скрайбы.



**Наталля СТУПЧЫК: «Тэксты бываюць не толькі класічныя. Ёсць яшчэ і мова малюнкаў...»**

— На сучасных вучняў абрушваецца такі паток інфармацыі, з-пад якога выбраўца амаль немагчыма. Усім знаёмая сітуацыя, калі вучні не спраўляюцца з заданнем, кідаюць яго і пачынаюць рабіць усё, што заўгодна, толькі не тое, што мы ад іх чакаем. Таму патрэбныя пэўныя «кручкі», каб яны здолелі дастаць неабходную інфармацыю і разматаць клубок ведаў, — разважае педагог. — А тэксты бываюць не толькі класічныя. Ёсць яшчэ і мова малюнкаў: вобразы, сімвалы, схемы, знакавыя мадэлі...

Для даведкі: эмодзі — мова ідэаграм і смайлікаў, якая выкарыстоўваецца ў электронных паведамленнях і вэб-старонках. Графічная мова, дзе словы замяняюцца спалучэннем карцінак, з'явілася ў Японіі і хутка распаўсюдзілася па ўсім свеце. У 2015 годзе Оксфардскі слоўнік назваў «эмодзі» словам года. Дарэчы, мова малюнкаў ужо афіцыйна замацаваная ў розных анлайн-перакладчыках. І яна вельмі блізкая і зразумелая сучасным вучням.

— Ёсць шмат карысных сайтаў з эмодзі. Ёсць сайты, якія дапамагаюць у іх стварэнні.

**Мова малюнкаў заснаваная на асацыяцыях. І не прачытаўшы твор, ты не зможаш зашыфраваць яго змест.**

Але як жа гэта працуе на ўроку? Для прыкладу, з дапамогай эмодзі мы шыфруем творы. Першы радок — гэта яго назва, а другі і трэці — кароткі змест, — растлумачыла Наталля Ступчык і прапанавала калегам канкрэтныя прыклады. Тыя з задавальненнем «расшыфравалі» творы Васіля Быкава «Знак бяды», Івана Шамякіна «Сэрца на далоні», «Песню пра зубра» Міколы Гусоўскага, «Дзікае паляванне караля Стаха» Уладзіміра Караткевіча і іншыя. А потым ім прапанавалі самім зашыфраваць з дапамогай эмодзі верш Рыгора Барадуліна «Трэба дома бываць часцей»...

— Мова малюнкаў заснаваная на асацыяцыях. І не прачытаўшы твор, ты не зможаш зашыфраваць яго змест. А мне адразу бачна, што для дзяцей засталося ў творы незразумелае, — кажа Наталля Ступчык. — Увогуле, тое, што адбывалася нават 20-40 гадоў таму, зусім далёкае для нашых вучняў, у творах класікаў яны сустракаюць шмат складаных для іх слоў і паняццяў, а мы з дапамогай малюнкаў можам засярodзіць увагу на нейкіх важных для разумення твора момантах. Можна прапанаваць вучням набор эмодзі, каб тыя расставілі малюнкі ў лагічным парадку.

Яшчэ адзін прыём — скрайбінг, які мае на ўвазе таксама работу з малюнкамі. Гэта спосаб падачы інфармацыі, пры якім тое, што кажа выступоўца, ілюструецца ў рэжыме рэальнага часу фламастарам або аплікацыяй на дошцы ці паперы. Адбываецца візуальная фіксацыя ключавых момантаў. Вядома, што больш за 80 працэнтаў інфармацыі чалавек успрымае візуальна. Праз тры дні ён у стане ўспомніць толькі дзесяць працэнтаў ад усяго аб'ёму пачутага. Разам з тым вусны аповед «з малюначкамі» запамінаецца нашмат лепш, чым звычайная «лекцыя». А на ўроках літаратуры скрайбінг дапамагае дзецям візуалізаваць іх чытацкія ўражанні.

— Скрайбінг — гэта працэс, а скрайб — прадукт, карцінка, набор малюнкаў на зададзеную тэму, аб'яднаных агульнай ідэяй, — тлумачыць Наталля Ступчык. — Скрайбы могуць быць маляваныя, аплікацыйныя, магнітныя, камп'ютарныя... Я карыстаюся наступным алгарытмам стварэння скрайбаў. Спачатку рыхтую сцэнарый, прадумваю асноўную ідэю і яркія вобразы. Выбіраю форму і спосаб падачы. Рыхтую скрайб-набор. Можна стварыць скрайбы самому або падабраць камплект патрэбных малюнкаў. На «ўра» ў мяне ідзе выкарыстанне скрайбаў пры вывучэнні тэмы «Адушаўлёныя і неадушаўлёныя назоўнікі». Візуальна дзецям прасцей зразумець, што паняцці «жывое і нежывое» ў навакольным свеце і «адушаўлёнае і неадушаўлёнае» ў мове не заўсёды супадаюць.

Скрайб можа ўяўляць з сябе стужку з некалькіх малюнкаў, размешчаных гарызантальна, але ж яны могуць быць прадстаўлены і ў выглядзе кола, вертыкальнай паласы, квадрата. Можна ствараць скрайб-карты падарожжа па апавяданні ці параграфе з падручніка па любым прадмеце. Прапануйце вучням размясціць прадметы, звязаныя з мастацкім творам, у пэўнай паслядоўнасці. Можаце дадаць і скрайбы не па тэме. Вучні павінны адабраць з іх толькі тое, што трэба.

Створаны скрайб падыдзе для тлумачэння новага матэрыялу і праверкі засвоенага, можа быць выкарыстаны як сродак абагульнення вывучанага, як аснова для дамашняга задання, як суправаджэнне да «мазгавога штурму» на ўроку. Гатовы скрайб — цудоўны нагляды дапаможнік, які можна выкарыстоўваць так, як гэтага патрабуе сітуацыя. Можна папрасіць навучэнцаў пракаментаваць прадстаўлены скрайб, адказаць на пытанні, знайсці памылку ў ім, абмеркаваць убачанае. Методыка работы з канкрэтным скрайбам будзе залежаць ад падрыхтаванасці класа і пастаўленых дыдактычных задач. Відавочна адно: дзякуючы скрайбінгу ўрокі «ажыўляюцца». А яшчэ ён развівае такія важныя навыкі лагічнага, вобразнага, крэатыўнага і крытычнага мыслення...

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

Медыяпрастора

# «Хочацца, каб газета была элітарным прадуктам»

**Газета «Мінская праўда» 1 лістапада адзначыла 70-гадовы юбілей. Выданне сёння мае сваё адметнае аблічча на рынку сродкаў масавай інфармацыі і працягвае рознабакова развівацца, адаптуючыся пад патрабаванні часу і аўдыторыі. Не так даўно было створана інфармацыйнае агенцтва «Мінская праўда», куды ўвайшлі абласная газета, раённыя выданні Мінскага, Уздзенскага і Дзяржынскага раёнаў, а таксама абласное радыё «Мінская хваля». Такая рэарганізацыя дае падставы думаць, што гісторыя выдання працягваецца і ў ёй будзе яшчэ шмат адметных старонак. З нагоды святочнай даты «Звязда» распытала галоўнага рэдактара «Мінскай праўды» Ларысу КОРШУН пра традыцыі, якім хочацца застацца вернымі, а таксама пра сучаснасць і магчымасці ёй адпавядаць, не губляючы сваіх пазіцый на рынку СМІ.**



***— Ларыса Міхайлаўна, вы адзін з самых маладых рэдактараў у гісторыі «Мінскай праўды». Ішлі на гэтую пасаду з тым, каб захаваць яе гісторыю і традыцыі ці рабіць рэформы?***

— У мяне з «Мінскай праўдай» цесная сувязь з 2017 года, калі яе і Дзяржынскую газету «Узвышша» аб'ядналі ў выніку рэарганізацыі. І з тых часоў я, можна сказаць, з выданнем не разлучалася. Той крок стаў для ўсіх нас вялікім стымулам для росту. Газеты перайшлі на каляровы друк «4 на 4», вёрстка стала новая. Таму, ужо азіраючыся на той час, разумееш, што без перамен рух наперад проста немагчымы. Але гэта не значыць, што мы абмінаем увагай гісторыю выдання. Бо вельмі важна берагчы мінулае і памятаць пра тое, што было зроблена людзьмі да цябе. Зроблена ж вельмі многа, інакш газета не святкавала б сваё 70-годдзе. Разам з тым важна прыўносіць і нешта новае. І гэта той шлях, па якім мы ідзём сёння.

**«Наша газета сёння існуе і працягвае развівацца — гэта вынік работы многіх пакаленняў журналістаў і кіраўнікоў выдання. Шчыра перакананая, што кожны рэдактар «Мінскай праўды» ўкладваў у яе сваю душу і час, каб зрабіць газету максімальна цікавай для чытачоў».**

***— Што вас зараз натхняе штосьці мяняць?***

— Людзі. Бо, калі глядзіш на людзей і чытаеш матэрыялы пра іх, то разумееш, што без чалавека газета губляе сваю каштоўнасць. Таму гэта для нас у прыярытэце. Зараз мы змянілі вёрстку, газета выглядае як таблоід, і тут важны перш за ўсё чалавек. Мне здаецца, такой жа стратэгіі прытрымліваліся і мае папярэднікі сярод журналістаў і рэдактараў «Мінскай праўды».

Несумненна, аператыўнасць, якасць падачы інфармацыі, імкненне рабіць па-новаму. Бо ў прынцыпе, усё паўтараецца з году ў год. Чытаць кожны раз пра суботнік у адным і тым жа фармаце нецікава, а вось калі пашукаць у гэтай тэме новы ракурс, то ў чытача ўзнікне жаданне пачытаць матэрыял. На жаль ці на шчасце, але час уносіць свае карэктывы ў нашу работу. Напрыклад, зараз у моладзі кліпавае мысленне, і мы павінны ўлічваць гэта і змяняцца. Таму ў нашых матэрыялах мы робім шмат выносак, буйныя фотаздымкі, загалоўкі і падзагалоўкі. Гэта дазваляе звярнуць увагу на матэрыял, бо сёння ўжо нікога не здзівіш вялікім аб'ёмам тэксту. А вось напісаць коратка і ёмка — больш складана, але ў такога матэрыялу больш шанцаў быць заўважаным чытачом.

***— Сёння, калі казаць пра навіны, падзеі людзі адсочваюць хутчэй з дапамогай сацыяльных сетак, чым традыцыйных СМІ. Што вы робіце, каб не страціць увагі сваёй аўдыторыі?***

— Па-першае, трэба раз'ядноўваць патокі інфармацыі. Калі мы кажам пра газету, то тут у прыярытэце аналітычная інфармацыя. Хочацца, каб газета была элітарным прадуктам. Калі ты прачынаешся, варыш каву і чытаеш яе. Ды і ўлічваючы сённяшнюю сітуацыю ў краіне, недахоп аналітыкі востра адчуваецца. Лічу, пры ўмове, калі ўсё будзе цікава падавацца на старонках выдання, то нас будуць чытаць, купляць і выпісваць. А ўся рэпартажная інфармацыя з мерапрыемстваў добра падыходзіць для сайта, дзе ў прыярытэце фота-, відэакантэнт. Плюс трэба займацца інтэграваннем, як і робяць у некаторых газетах, размяшчаючы тыя ж QR-коды, якія дазваляюць пераходзіць на сайт выдання ці на YouTube-канал. У прынцыпе, месца ўсёй аператыўнай інфармацыі — гэта выключна сайт, сацыяльныя сеткі і месенджары. Людзі лепш успрымаюць навіны там, а не ў газеце праз некалькі дзён.

***— Як спраўляецеся з канкурэнцыяй з боку раённых і рэспубліканскіх выданняў?***

— Канкураваць складана, пакольі друкаваных выданняў вельмі шмат. І для нас пэўная складанасць яшчэ і ў тым, што калі ў іншых абласцях ёсць абласныя цэнтры, на якія там і арыентуюцца газеты, то ў нас гэтага няма. Мы разумеем, што Мінск і так дастаткова перанасычаны рознымі СМІ, а наша асноўная аўдыторыя знаходзіцца ў рэгіёнах. Каб зацікавіць гэтую аўдыторыю, мы размяшчаем геалакацыю. Тобок чытач адразу можа сарыентавацца, што гэта напісана пра яго мясцовасць. Бо людзям перш за ўсё цікава чытаць пра сваё. А там, можа, ён і на аналітыку зверне ўвагу. У выніку чалавек падтрымлівае ваша выданне і рублём. Для гэтага газета павінна быць канкурэнтаздольная на рынку СМІ. І нам у гэтым сэнсе складана спаборнічаць нават не з рэспубліканскімі выданнямі, а з раённымі, бо апошнія даюць найбольш інфармацыі пра рэгіёны. Але тут мы, як мне здаецца, не столькі канкурыруем, колькі дапамагаем адно аднаму. Вось глядзіце, у нас у холдынгу, дзе аб'яднаны абласная газета з раёнкамі Дзяржынскага, Уздзенскага і Мінскага раёнаў, чытач атрымлівае адразу дзве газеты. І за кошт гэтага ён мае магчымасць чытаць інфармацыю пра сваю мясцовасць, пададзеную з розных ракурсаў і ў розных жанрах. Думаю, названы падыход, які паспяхова рэалізавалі ў свой час, добра паказвае сябе і сёння.

**«Вельмі важна берагчы мінулае і памятаць пра тое, што было зроблена людзьмі да цябе».**

***— «Мінская праўда» ў параўнанні з іншымі выданнямі візуальна адметная. Гэта такая правакацыя, каб звярнуць на сябе ўвагу ці свядомы крок у развіцці?***

— Так, гэта было ўзважанае рашэнне, і ў прынцыпе ніякай правакацыі мы ў ім не хавалі, але з пэўнай крытыкай пры пераходзе на новую вёрстку давялося сутыкнуцца. Мы пайшлі часткова тым жа шляхам падачы ідэалагічна правільнай інфармацыі, як робяць гэта ў незалежных СМІ нашай краіны. Калі такія фарматы апраўдваюць сябе за мяжой і тыя ж таблоіды карыстаюцца попытам у чытача, то што перашкаджае нам выкарыстоўваць падобны падыход? Асабліва ў наш няпросты час, калі так важна данесці патрэбную інфармацыю да аўдыторыі. Чаму не падаваць яе цікава і няхай часам нават правакацыйна? Мы неяк нават зрабілі першую паласу ў плакатным стылі, дзе адштурхоўваліся ад нумара The Guardian, калі яны апублікавалі партрэт беларускай дзяўчыны з недзяржаўнай сімволікай. Мы не рабілі з гэтага сакрэту, хоць некаторыя СМІ і спрабавалі абвінавачваць нас у плагіяце, але нам хацелася проста адказаць брытанскаму выданню на гэта сваёй асацыяцыяй. І мы прадставілі на першай паласе дзяўчыну з нашым дзяржаўным сцягам. Вядома, разумелі, што такі ход можа выклікаць розныя рэакцыі. Але лепш так, чым маўчаць, быццам бы нічога вакол цябе не адбываецца. Заўсёды ёсць магчымасці адпавядаць часу.

***— «Мінская праўда» — цэнтральная газета цэнтральнага рэгіёна краіны». Наколькі складана адпавядаць гэтаму дэвізу?***

— Спрабуем, хоць самім сябе складана ацэньваць. Наколькі мы паспяховыя ў гэтым, думаю, лепш судзіць нашым чытачам. Хоць часам здаецца, што ты ўсё зрабіў нэправільна і не так, а чалавек тэлефануе і дзякуе.

***— То-бок, зваротная сувязь з чытачамі не губляе сваёй сілы...***

— Трэба разумець, што з часам званкоў і пісем будзе яшчэ менш, чым зараз. Таму што развіваюцца новыя формы сувязі. Мы вось збіраем прапановы па змяненнях у Канстытуцыю і іх дасылаюць толькі з выкарыстаннем формы зваротнай сувязі на сайце і праз тэлеграм-бот. Набраць тэкст і імгненна адправіць яго адрасату людзям сёння прасцей, чым ісці на пошту і дасылаць ліст.

***— Юбілей газеты, якая адзначае 70-годдзе, для вас — падстава задумацца пра што?***

— Па-першае, мне хочацца падзякаваць усім тым людзям, якія ў розныя гады працавалі ў «Мінскай праўдзе». Тое, што наша газета сёння існуе і працягвае развівацца — гэта вынік работы многіх пакаленняў журналістаў і кіраўнікоў выдання. Шчыра перакананая, што кожны рэдактар «Мінскай праўды» ўкладваў у яе сваю душу і час, каб зрабіць газету максімальна цікавай для чытачоў. Я працягваю тое, што зрабілі мае папярэднікі. Без гэтага быў бы немагчымы наш рух наперад. І для нашага калектыву 70-годдзе выдання — добрая нагода яшчэ больш аб'яднацца і стаць мацнейшымі. Спадзяюся, газета адсвяткуе яшчэ не адно дзесяцігоддзе. Бо ў нас цікавая гісторыя, якую варта згадваць, расказваць і працягваць агульнымі сіламі. Мы, дарэчы, калі пагарталі архівы газеты, убачылі, што раней пісалі даволі адкрыта і востра. І нам варта працягваць заставацца вернымі такому кірунку.

**Алена ДРАПКО.**
**Фота з архіва «Мінскай праўды».**



Мясцовае Самакіраванне

6 лістапада 2020 г. № 42 (578)

Штотыднёвы дадатак газеты ЗВЯЗДА

ГАЗЕТА ДЛЯ ВЫБАРШЧЫКАЎ І ДЭПУТАТАЎ МЯСЦОВЫХ САВЕТАЎ

НА СЛЫХУ!

# Прыгожыя, разумныя, эрудзіраваныя, але адчуваецца недаінфармаванасць



**Старшыня Савета Рэспублікі Наталля КАЧАНАВА сустрэлася са студэнтамі Белдзяржуніверсітэта. Адбылася шчырая размова.**



Як паведамляе прэс-служба верхняй палаты парламента, зносіны спікера са студэнцкай моладдзю былі арганізаваны па ўзаемнай ініцыятыве — студэнты БДУ раней агучвалі сваё жаданне сустрэцца з прадстаўнікамі вышэйшых органаў дзяржаўнай улады. Старшыня Савета Рэспублікі, у сваю чаргу, рэгулярна сустракаецца з моладдзю краіны падчас розных мерапрыемстваў.

Гутарка Наталлі Качанавай са студэнтамі БДУ доўжылася больш за тры з паловай гадзіны, падчас якой быў узняты шэраг пытанняў, у прыватнасці, аб перадвыбарнай гонцы на выбарах Прэзідэнта — 2020, перспектывах развіцця Беларусі і іншыя хвалюючыя тэмы.

Старшыня Савета Рэспублікі адзначыла, што размова ў Белдзяржуніверсітэце адбілася ва ўспрымальнай самымі прыемнымі ўражаннямі.

— Яны прыгожыя, разумныя, эрудзіраваныя людзі, але адчуваецца недаінфармаванасць, — адзначыла яна і прапанавала студэнтам працягваць сустрэчы і дыскусіі. У моладзі маюцца канкрэтныя канструктыўныя прапановы. Так, у аўдыторыі прысутнічаў студэнт, які ажыццяўляе 3D-друк насадак для канцэнтратараў і апаратаў штучнай вентыляцыі лёгкіх. Па просьбе медыкаў ён вырабляе і перадае іх у бальніцы, дзе лечаць пацыентаў з COVID-19.

Студэнты падзякавалі спікеру Савета Рэспублікі за адкрытасць і адзначылі ўдалы фармат размовы.

— Абмен думкамі — патрэбны, карысны — адбыўся. Быў лес рук і вялікая колькасць пытанняў і адказаў. З цікавасцю ўспрынялі прапанову паўдзельнічаць у дзейнасці Маладзёжнага парламента і яго праектах, — такое меркаванне выказаў студэнт-магістрант ФПМІ Дзмітрый Баранаў. Ён расказаў, што разам з іншымі студэнтамі гатовы аргументавана выкласці бачанне таго, як Міністэрства адукацыі і ВНУ трэба вырашаць сітуацыю з пропускамі заняткаў.

Папрасіўшы аб наступнай сустрэчы, студэнты паабяцалі прыйсці на яе з канкрэтнымі прапановамі. Напрыканцы мерапрыемства каля паловы прысутных на сустрэчы студэнтаў скарысталіся магчымасцю пагутарыць са старшынёй Савета Рэспублікі па асабістых пытаннях.

**Фота sovrep.gov.by.**



БЛІЗКАЯ ЎЛАДА

# ЯКІ ІНДЫКАТАР?

## Без фармалізму і па выяўляльным прынцыпе

**Ад фармалізму ў рабоце са зваротамі грамадзян неабходна пазбаўляцца, пра гэта заявіла старшыня Савета Рэспублікі Наталля КАЧАНАВА на пасяджэнні Прэзідыума Савета Рэспублікі, у цэнтры ўвагі якога былі звароты людзей.**

Спікер верхняй палаты парламента адзначыла, што звароты — гэта не толькі вельмі важная сувязь і форма дыялогу з народам, але яшчэ і індыкатар дзейнасці ўлады. Менавіта таму рашэнне пытанняў па кожным звароце неабходна даводзіць да лагічнага завяршэння. Як паведамляе прэс-служба Савета Рэспублікі, па гэтай прычыне ў практыку работы сенатараў са зваротамі, у прыватнасці, сацыяльна неабароненых слаёў насельніцтва (людзей сталага веку, людзей з інваліднасцю, шматдзетных сем'яў і іншых катэгорый), будзе ўкаранёны выяўляльны прынцып.

Для максімальна эфектыўнага вырашэння праблемных пытанняў да ўдзелу ў асабістых прыёмах грамадзян членаў Савета Рэспублікі будуць прыцягвацца службовыя асобы выканкамаў і іншыя зацікаўленыя.

Дарэчы, усяго за дзевяць месяцаў гэтага года сенатары разгледзелі 3417 зваротаў, 2446 з іх (68,6 %) разгледжаны членамі Прэзідыума. Колькасць паўторных зваротаў склала 14 %, калектыўных — 4,4 %.

Часцей за ўсё звароты паступалі да членаў Савета Рэспублікі, абраных ад Мінскай (416 падчас 101 асабістага прыёму) і Гродзенскай (415 падчас 104 асабістых прыёмаў) абласцей, радзей — да сенатараў, абраных ад Гомельскай (158 падчас 85 асабістых прыёмаў) і Магілёўскай (178 падчас 80 асабістых прыёмаў) абласцей. Трэба сказаць, што члены Савета Рэспублікі правялі 674 асабістыя прыёмы, на якіх прынялі 1965 грамадзян. Адбылося таксама 276 прамых ліній.

У большасці выпадкаў звароты насілі індывідуальны характар. Значная іх частка датычылася пытанняў жыллёвага фонду і жыллёва-камунальнай гаспадаркі. Праблемы, якія закранаюць шырокае кола асоб, падымаліся больш чым у 250 зваротах.

Акцэнтуючы ўвагу на неабходнасці ўзмацнення дзейнасці па зваротах грамадзян на месцах — у рэгіёнах, ад якіх былі абраныя сенатары, Наталля Качанава звярнула ўвагу на работу грамадскіх прыёмных. Спікер падкрэсліла, што яны павінны актывізаваць сваю дзейнасць, і ў ёй павінны быць задзейнічаны ўсе службовыя асобы. Кантроль за гэтым пачнецца з рэгіёнаў, рэзюмавала старшыня Савета Рэспублікі.

СУПРАЦОЎНІЦТВА

# Інфармацыя з аб'ектыўных крыніц

## Нацыянальны сход Беларусі гатовы да канструктыўнага дыялогу з замежнымі калегамі

**Аб гэтым заявіў журналістам старшыня Пастаяннай камісіі па міжнародных справах і нацыянальнай бяспецы Савета Рэспублікі Сяргей РАЧКОЎ. Ён прыняў удзел у пасяджэнні кіруючага савета Міжпарламенцкага саюза, які быў арганізаваны ў фармаце відэаканферэнцыі.**

— Міжпарламенцкі саюз — найстарэйшая міжпарламенцкая арганізацыя, створаная ў канцы XIX стагоддзя. У яе склад уваходзяць 179 парламентаў, у тым ліку і Нацыянальны сход Беларусі. Мы заўсёды надавалі вялікае значэнне рабоце ў гэтай арганізацыі. Разглядаем яе як найважнейшую пляцоўку для абмену думкамі, вопытам, экспертызай. Заўсёды вельмі актыўна ўдзельнічаем ва ўсіх мерапрыемствах саюза, пачынаючы ад асамблеі і завяршаючы канферэнцыямі, семінарамі. Мы падтрымліваем тую лінію, якую праводзіць кіраўніцтва МПС на павышэнне эфектыўнасці дзейнасці арганізацыі, — цытуе Сяргея Рачкова БелТА.

Сенатар адзначыў, што разам з такімі важнымі тэмамі, як прыцягненне моладзі да прыняцця дзяржаўных рашэнняў, гендарная роўнасць, на сёлетнім парадку дня — барацьба з распаўсюджваннем COVID-19.

— Мы інфармавалі ў рамках Міжпарламенцкага саюза аб сітуацыі ў Беларусі, дзяліліся сваім вопытам. Лічу, што мы зрабілі вельмі шмат па супрацьдзеянні гэтай інфекцыі, — паведміў ён.

Паралельна з дзейнасцю на міжпарламенцкіх пляцоўках актыўна праходзіла работа і на двухбаковых трэках з парламентамі замежных дзяржаў. У прыватнасці, функцыянавалі чатыры міжпарламенцкія камісіі і 72 рабочыя групы па супрацоўніцтве з парламентамі замежных дзяржаў.

— У апошнія дні кіраўнікі міжпарламенцкіх камісій і рабочых груп звярнуліся з пасланнямі да сваіх калег у замежных дзяржавах, у якіх давялі аб'ектыўную сітуацыю ў Беларусі. Мы падкрэслілі знешняе ўздзеянне на тыя працэсы, што адбываюцца ў краіне, на ўмяшальніцтва ва ўнутраныя справы. Мы заклікалі нашых калег атрымліваць інфармацыю з аб'ектыўных крыніц і падкрэслілі, што гатовыя заўсёды даваць гэтую аб'ектыўную інфармацыю. Гатовыя да канструктыўнага, прафесійнага, але наступальнага ўзаемадзеяння па гэтых пытаннях. У цяперашні час Нацыянальны сход Беларусі — Палата прадстаўнікоў і Савет Рэспублікі — канкрэтна занятыя актуальнымі праблемамі, якія хвалююць Беларусь, і выкарыстоўваюць у гэтых мэтах усе магчымыя інструменты, уключаючы парламенцкую дыпламатыю, — падкрэсліў сенатар.

Адзначым, што 206-я Сесія кіруючага савета Міжпарламенцкага саюза праходзіла з 1 да 4 лістапада.

### Даведка «МС»

Міжпарламенцкі савет з'яўляецца важнай пляцоўкай для абмеркавання пытанняў міжнароднага ўзроўню, выказвання розных пазіцый і меркаванняў. З 1995 года Беларусь мае права ўдзельнічаць у абмеркаванні, даносіць сваю пазіцыю, прымаць пункт гледжання парламентарыяў іншых краін.

## Якасць жыцця і заканадаўчыя прапановы

**У мінулую суботу на пытанні гараджан адказваў старшыня Мінскага гарадскога Савета дэпутатаў Андрэй БУГРОЎ. На яго прамую тэлефоную лінію звярнуліся 32 мінчаніны.**

Кола пытанняў было ў пэўным сэнсе традыцыйнае: у пераважнай большасці людзі прасілі дапамагчы ў вырашэнні сезонных гаспадарчых праблем, якія псуюць ім настрой, ствараюць нязручнасці. Заяўнікі звярталі ўвагу старшыні гарадскога Савета дэпутатаў на хібы ў дзейнасці службаў жыллёва-камунальнай гаспадаркі, скардзіліся на перабоі ў забеспячэнні халоднай і гарачай вадой, зацягнутыя тэрміны капітальнага рамонту жылых шматпавярховых дамоў, парушэнні графіка замены ліфтаў, недахопы ў добраўпарадкаванні дваровых тэрыторый. Закранаді яны і іншыя пытанні аб тым, што перашкаджае камфортнаму жыццю.

У гэтым сэнсе паказальны зварот жыхароў дома № 21 па вуліцы Фролікава, які чакае капітальны рамонт. У доме жывуць восем інвалідаў, шмат сталых людзей. Іх моцна насцярожылі планы будаўнікоў: на час рамонтных работ адключыць газ, каналізацыю, водазабеспячэнне і ацяпленне.

— І гэта напярэдадні зімы і ў час пандэміі? Ці можна так рабіць, — пыталіся людзі ў старшыні гарсавета.

Андрэй Бугроў супакоіў суразмоўцаў. І сапраўды, на яго погляд, у такой сітуацыі лагічна пачаць рамонт з даху і фасада. Ён паабяцаў звярнуцца ў адміністрацыю раёна, каб там улічылі зварот жыхароў дома і пачалі капрамонт без адключэння вады і ацяплення.

Былі званкі і наконт паляпшэння ўмоў жыцця інвалідаў, выдзяленні жылля тым, хто мае ў ім вострую патрэбу і г. д.

Вядома, найлепшы адказ на зварот — аператыўнае вырашэнне праблемы, з якой звярнуўся чалавек на прамую лінію. Каб паскорыць працэс удакладнення сітуацыі, а значыць і ход рэагавання, Андрэй Бугроў мог пераадрасаваць пытанне намеснікам кіраўнікоў адміністрацый раёнаў сталіцы, якія ў той час знаходзіліся на рабочых месцах і валодалі інфармацыяй аб справах на сваёй тэрыторыі. І такі падыход дазваляў хутчэй дасягнуць станоўчага выніку ў той жа дзень.

Але не заўсёды атрымліваецца зрабіць гэта хутка і адразу проста з кабінета. Некаторыя пытанні патрабуюць непасрэднай прысутнасці на месцы, каб на свае вочы ўбачыць, адчуць маштаб і сутнасць праблемы. У найбліжэйшыя дні Андрэй Бугроў запланаваў асабісты выезд на месца і сустрэчу з двума аўтарамі звароту па аднолькавым пытанні, каб потым з прадстаўнікамі гарадскіх службаў знайсці прымальнае рашэнне ўзнікшай праблемы.

Андрэй Аляксандравіч таксама паведаміў карэспандэнту «МС», што было і пытанне адносна ўдасканалення работы мясцовага кіравання і самакіравання ў Мінску. Старшыня гарсавета запрасіў суразмоўніка да ўдзелу ў рабоце чарговай дыялогавай пляцоўкі, дзе грунтоўна абмяркоўваецца рэфармаванне ўсёй сістэмы мясцовага самакіравання, каб выказацца па гэту тэму, унесці канкрэтныя прапановы аб зменах у дзеючае заканадаўства.

**Леанід ТУГАРЫН.**

НАД ЧЫМ ПРАЦУЕМ?

# АБАРОНА ІНТАРЭСАЎ

## Спажыўцы павінны бачыць, што́ за прадукт яны набываюць



**Такое меркаванне выказаў старшыня Пастаяннай камісіі па рэгіянальнай палітыцы і мясцовым самакіраванні Савета Рэспублікі Міхаіл РУСЫ падчас удзелу ў пашыраным пасяджэнні Пастаяннай камісіі па аграрнай палітыцы Палаты прадстаўнікоў, на разгляд якой вынесены законапраект «Аб змяненні Закона Рэспублікі Беларусь «Аб ідэнтыфікацыі, рэгістрацыі, прасочваемасці сельскагаспадарчых жывёл (статкаў), ідэнтыфікацыі і прасочваемасці прадуктаў жывёльнага паходжання».**

Законапраект рыхтуецца на разгляд восеньскай сесіі парламента ў другім чытанні, паведамляе БелТА.

— Гэта не толькі запатрабаваны і чаканы законапраект, ён вельмі неабходны, каб весці гандаль не толькі ўнутры краіны, але і за яе межамі. Спажыўцы павінны бачыць, што́ за прадукт яны атрымліваюць: дзе ён выраблены, на якім прадпрыемстве. Калі з буйной рагатай жывёлай, свінагадоўляй, малочным статкам усе гэтыя пытанні адпрацаваны, то цяпер — новы крок, каб да гэтага працэсу маглі далучыцца асабістыя падсобныя і фермерскія гаспадаркі, якія займаюцца развядзеннем птушкі, пчол, каб пакупнік не сумняваўся, што гэта экалагічна чыстая прадукцыя, — перакананы Міхаіл Русы.

Вопыт ідэнтыфікацыі жывёл, які сёння існуе ў краіне, дазволіць ажыццявіць ідэнтыфікацыю і рэгістрацыю новых відаў жывёл для ўсіх суб'ектаў адносін. Пры гэтым дзеянне закона будзе распаўсюджвацца толькі на жывёл і прадукты жывёльнага паходжання, з якіх атрымліваюць прыбытак. Прадукты жывёльнага паходжання, вытворчасць якіх ажыццяўляецца фізічнымі асобамі для ўласных патрэб, пад дзеянне закона не падпадаюць.



Па словах сенатара, законапраект павысіць бяспеку пры перамяшчэнні жывёл і прадуктаў жывёльнага паходжання як па тэрыторыі нашай краіны, так і за яе межамі.

— Гэта абарона спажыўца, бяспека насельніцтва і эканамічная бяспека краіны, гэта значыць канкурэнтаздольнасць. Мы сёння можам працаваць на любых сусветных рынках. Нашы прадпрыемствы пастаўляюць прадукты харчавання ў 114 краін. Увесь час адкрываюцца новыя рынкі. Зараз мы вельмі добра працуем з Кітаем, В'етнамам, трэба смялей ісці на рынак Еўразаюза, — падкрэсліў сенатар.

# Ні адзін зварот не застанецца па-за ўвагай

**На кожную прамую тэлефонную лінію, што праводзіць старшыня Мінскага абласнога Савета дэпутатаў Наталля ЯКУБІЦКАЯ, паступае практычна каля трыццаці званкоў. На гэты раз іх было не менш. Людзей хвалявалі стан дарог, паляпшэнне жыллёвых умоў, добраўпарадкаванне, работа маршрутных таксі і шмат іншых пытанняў.**

— У нашай вёсцы Дуброва, што ў Смалявіцкім раёне, на вуліцы Цэнтральная вельмі вузкая дарога. А каля дома № 15 яе шырыня дзесьці тры метры. Акрамя таго, тут знаходзіцца горка. І кіроўцы машын не бачаць сустрэчнага транспарту, што стварае небяспеку і пагрозу для жыцця як пасажыраў, так і пешаходаў. Тут ужо былі аварыі. А дзе гарантыя, што гэта апошняе дарожна-транспартнае здарэнне? — хвалявалася Наталля Анатолеўна.

Па яе словах, на гэтым адрэзку вуліцы няма дарожных і абмежавальных знакаў.

Наталля Якубіцкая паабяцала звязацца са спецыялістамі і папрасіць іх выехаць на месца, каб вывучыць сітуацыю і прыняць захады да выпраўлення сітуацыі.

У цяжкія жыццёвыя абставіны трапіла Ганна Уладзіміраўна з вёскі Копішча Мінскага раёна. Яна пражывае ў двухпакаёвай кватэры з усімі выгодамі. Здавалася б, жыві ды радуйся. Але шчасця ад гэтага мала. Разам з ёй тут туляцца яшчэ дзевяць дамачадцаў: муж, трое іх дзяцей, свёкар са свякроўю і чацвёра іх сыноў. Калі раптам усім трэба адначасова некуды збірацца — дарослым на работу, дзецям у школу, то праблематычна схадзіць у ванную, туалет. Усё распісана літаральна па хвілінах.

— Мы як шматдзетная сям'я стаім у чарзе на паляпшэнне жыллёвых умоў. Нам сказалі чакаць. Але ўжо не стае больш сіл, — скардзілася жанчына. — Магчыма, пра нашу сям'ю наогул забылі.

Наталля Якубіцкая супакоіла заяўніцу, што разбярэцца ў сітуацыі, і паабяцала даведацца, пад якім нумарам яны стаяць у чарзе на атрыманне кватэр, і даць пісьмовы адказ.

Ніна Мікалаеўна заклапочана тым, што праз іх вёску Вялікая Ухалода рэдка ходзяць маршруткі да Барысава. Першая адпраўляецца а дзявятай гадзіне раніцы, а наступная — у 12.30. У райцэнтр даводзіцца часта ездзіць па справах. Напрыклад, у аптэку, паліклініку. Навучэнцам таксама складана дабрацца своечасова на вучобу ў каледж. Населены пункт вялікі. І людзі просяць пусціць сюды дадатковыя маршруткі.

Наталля Віктараўна тут жа звязалася з адпаведнымі службамі і папрасіла, каб павялічылі колькасць рэйсаў.

Валянціна Леанідаўна з вуліцы Паркавай у Ждановічах распавяла, што пасля капітальнага рамонту дому з двара забралі лаўкі. І да гэтага часу іх не могуць паставіць назад. У доме жыве шмат пенсіянераў, якім няма дзе прысесці, сустрэцца, пагаманіць. Сітуацыя працягваецца каля года, хоць яны звярталіся ў розныя інстанцыі па дапамогу. Іх проста не чуюць.

Старшыня Мінаблсавета запэўніла, што пытанне вырашыцца ў найбліжэйшы час.

Таццяна Уладзіміраўна паскардзілася, што не можа трапіць на магілкі ў вёсцы Забалоцце, дзе пахаваны яе родныя. Надаўна бура паваліла дрэва на магілу яе бацькі, пашкодзіла помнік і агароджу, а таксама агароджу, за якой пахавана маці. Жанчына звярнулася ў сельвыканкам, каб іх аднавілі, але ёй адмовілі па той прычыне прыродных катаклізмаў — гэта форсмажорныя абставіны.

Наталля Якубіцкая паабяцала разабрацца ў гэтым пытанні і, калі ёсць магчымасць, вырашыць яго на карысць заяўніцы.

Усіх, хто тэлефанаваў, старшыня Мінаблсавета ўважліва выслухала. Адны атрымалі неабходную кансультацыю. Іншым будуць высланы пісьмовыя адказы ў пазначаныя заканадаўствам тэрміны. Па тых праблемах, якія патрабуюць дадатковага вывучэння, спецыялісты выедуць на месца.

**Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ.**

У ТЭМУ

## Эфектыўны інструмент

**Прамыя лініі і асабістыя прыёмы грамадзян — гэта магчымасць не толькі абмеркаваць з прадстаўніком заканадаўчай улады тэмы, што хвалююць, але і атрымаць рэальную дапамогу. Такія сустрэчы даўно ўжо сталі эфектыўным інструментам, упэўнены член Савета Рэспублікі Сяргей АНЮХОЎСКІ.**

Такое меркаванне ён выказаў на сваёй асабістай старонцы ў адной з сацыяльных сетак. Нягледзячы на пандэмію, такія сустрэчы адбываюцца па графіку. Чарговая прайшла ў Бабруйску 4 лістапада. Падчас правядзення прамой лініі і асабістага прыёму грамадзян былі агучаны пытанні працаўладкавання, арганізацыі дзейнасці прадстаўнікоў малога бізнесу. Як будуць далей вырашаць ўзнятыя заяўнікамі праблемы, сенатар абяцае пракантраляваць.

**Вольга АНУФРЫЕВА.**



Фота sovrep.gov.by.

# Успамінаем Андрэя Макаёнка на «Беларусь 3»

**З нагоды 100-годдзя славутага літаратара сацыякультурны канал падрыхтаваў паказ адрэстаўраванага гульнявога кіно, пастаўленага па яго п'есе, і ўнікальнага запісу творчага вечара Андрэя Ягоравіча, а таксама серыі дакументальнага праекта ўласнай вытворчасці і спецыяльных відэаролікаў. Народны пісьменнік БССР Андрэй Макаёнак нарадзіўся 12 лістапада 1920 года. Напісаў шмат п'ес, вядомы таксама як сцэнарыст фільмаў «Шчасце трэба берагчы», «Кандрат Крапіва», «Рагаты бастыён» і іншых твораў, якія і сёння ўспамінаюцца і па-ранейшаму гучаць актуальна.**

Ужо зараз гледачоў «Беларусь 3» у міжпраграмных перапынках вітаюць вядомыя дзеячы беларускай культуры: Павел Сапоцька, Рыгор Сітніца, Валерый Анісенка і Алесь Суша — у серыі відэазамалёвак «Андрэй Макаёнак. Думкі» яны зачытваюць урыўкі з асабістых успамінаў, дзённікаў і нататак Андрэя Ягоравіча.

Праграма «Запіскі на палях» 12 лістапада распавядзе пра самыя цікавыя і невядомыя факты з творчай біяграфіі пісьменніка, а пасля будзе паказана адна з работ Андрэя Макаёнка ў якасці кінасцэнарыста — экранізацыя п'есы «Лявоніха на арбіце» — народная камедыя Пятра Васілеўскага «Рагаты быстыён», адрэстаўраваная на кінастудыі «Беларусьфільм» у фармаце HD.

На завяршэнне дня «Беларусь 3» прапануе паглядзець унікальны запіс, які захоўваецца ў фондах Белтэлерадыёкампаніі, — творчы вечар Андрэя Макаёнка «Ліра», запісаны ў студыі медыяхолдынга амаль 40 гадоў таму! Гледачы з першых вуснаў даведаюцца, як Андрэй Ягоравіч працаваў у дзяцінстве пастухом, як знакамітая актрыса Галіна Макарава, дзякуючы драматургу, атрымала сваю першую галоўную ролю ў спектаклі і як пісьменнік ставіўся да тэатральных крытыкаў.

**Алена ДРАПКО.**



## ШАШКІ
**(«Звязда»)**

10 кастрычніка ўпершыню адбыўся чэмпіянат Беларусі па шашках-100 па маланкавай гульні сярод мужчын і жанчын. У мужчынскім турніры прынялі ўдзел 22 шашыста ў дзевяці турах па швейцарскай сістэме. Пераможцамі сталі Уладзіслаў Валюк — 14 ачкоў, Аляксей Куніца і Андрэй Валюк — па 12 ачкоў. У жанчын 14 удзельніц у сямі турах па швейцарскай сістэме разыгралі медалі. Упэўнена перамагла майстар Вікторыя Нікалаева — 12 ачкоў з 14 магчымых. Сярэбраны медаль выйграла Дар'я Нікіфарава — 10 ачкоў. Бронзавы медаль у майстра з Гомеля Ганны Барашкі.

З 16 да 19 кастрычніка адбыўся чэмпіянат Мінскай вобласці па шашках-64 сярод мужчын і жанчын — інвалідаў па зроку. У мужчын два ўдзельнікі набралі па 8 ачкоў з 10 магчымых. 1-е месца па каэфіцыенце дасталося Аляксандру Кур'яну, на другім — Канстанцін Набокаў, трэцім фінішаваў Мікалай Акульскі — 6 ачкоў. У жанчын упэўнена перамагла Марыя Лясун — 9 ачкоў з 10 магчымых. Другой фінішавала Ірына Фядотава — 7 ачкоў. На трэцім месцы Вераніка Слюсарэнка — 6 ачкоў.

Беларускія майстры шашачнай кампазіцыі Аляксандр Развнка і Віктар Шульга атрымалі званні акадэмікаў прэстыжнай Санкт-Пецярбургскай акадэміі шахматнага і шашачнага мастацтва.

Наступныя пазіцыі прапануюцца для самастойнага рашэння.

**№ 116**



**№ 116** В. Варушыла (Мінск)
**Белыя простыя шашкі:** c1, e1, b2, f2, c3, g3, b4, d4 (8).
**Чорныя простыя шашкі:** a5, g5, b6, f6, c7, e7, g7, b8 (8).
**№ 117** А. Кагоцька (Бабруйск)
**Белыя простыя шашкі:** d4, e5, g5, b6, c7 (5).
**Чорныя простыя шашкі** b2, d2, f2, c3, a5, h6 (6).
**№ 118** А. Кагоцька
**Белыя простыя шашкі:** c1, f4, g5, f6, g7 (5).
**Чорныя простыя шашкі:** d2, c3, e3, h4, c5, c7 (6).
**№ 119** В. Варушыла
**Белыя простыя шашкі:** 48, 43, 30, 25, 20 (5).
**Чорныя простыя шашкі:** 32, 28, 29, 19, 13 (5).
**№ 120** Г. Спаньер (Нідэрланды)
**Белыя простыя шашкі:** 43, 38, 39, 40, 20, 6 (6).
**Чорныя простыя шашкі:** 35, 28, 17, 19, 1, 4 (6).
**№ 121** В. Кручкоў (Украіна)
**Белыя простыя шашкі:** 49, 39, 40, 34, 24, 19, 11, 14, 15 (9).
**Чорныя простыя шашкі:** 45, 38, 31, 27, 28, 22, 18, 6, 8, 5 (10).

Ва ўсіх пазіцыях белыя пачынаюць і выйграюць. Прозвішчы чытачоў, якія дашлюць правільныя адказы, будуць апублікаваныя.

Праверце свае рашэнні: выпуск № 125 ад 23.10.2020.

№ 108 1. 4034 2940 2. 3544 2435 3. 2520 1425 4. 3329 2334 5. 3930 2534 6. 2721 2628 7. 3205 1117! Чорныя, злавіўшы дамку, выйгралі.

№ 109 1. 3126 1014! 2. 2617 1122 3. 2817 2329 4. 3412 1318 5. 1223 1946+

№ 110 1. 3126 2127 2. 3631 2736 3. 4741 3647 4. 4943 3629 5. 3405+

№ 111 1. e5-d6 c7:e1 2. a5-b6 a7:c5 3. g1-f2 e1:g3 4. h2:c1 h4-g3 5. e3-f4 g3:e5 6. c1-e3 e5-d4 7. e3:c5 f6-g5 8. c5-d6 g5-h4 9. d6-c7 h4-g3 10. c7:h2+

№ 112 1. a7-b8 b6:d4 2. a3-b4 c3:a5 3. e1:e5 f4:d6 4. h2:f4 g5:e3 5. b8:d2+

№ 113 1. d6-e7 f8:b4 2. h6:c1 a7:c5 3. h4-g5 f4:h6 4. c1:d2 d4-c3 5. d2:b4 h6-g5 6. b4-d6 g5-h4 7. d6-c7 h4-g3 8. c7:h2+

№ 114 1. 28-23 18:29 2. 31-27 21:32 3. 38:27 29:49 4. 27-21 49:19 5. 21:05 15:24 6. 05:23+

№ 115 1. 31-27 22:31 2. 32-27 31:22 3. 42-37 41:32 4. 38:18 29:49 5. 18-12 49:19 6. 12:05 15:24 7. 05:01+

Першымі дакладныя адказы даслалі В. Дударэвіч (Брэсцкая вобласць, Баранавіцкі раён, в. Новая Мыш), А. Галаванаў, П. і В. Шульгі, (усе — Мінск). С. Рашэцін (Ашмяны), Ф. Карпей, Л. Жыхар (абодва — Мядзел), У. Панько (Каменец), І. Ананіч (Гродна), В. Ваўчкоў (Маладзечна), В. Таўкачоў (Клімавіцкі раён).

Пішыце на адрас: газета «Звязда», вул. Б. Хмяльніцкага, 10А, 220013, Мінск. E-mail: info@zviazda.by або vorush@yandex.ru

**Віталь ВАРУШЫЛА, майстар спорту.**





Сядзі і глядзі

# СУСТРЭЧЫ З ВЯЛІКАЙ АКТРЫСАЙ

**На наступным тыдні, 12 лістапада, споўніцца 85 гадоў з дня нараджэння вялікай артысткі Людмілы Гурчанкі. Сябе яна рэалізоўвала як актрыса і спявачка. У кіно запомнілася гледачам сваімі камедыйнымі і вострахарактарнымі ролямі ў фільмах «Карнавальная ноч», «Мама», «Саламяны капялюшык» і іншых. А яе драматычны талент можна назіраць у карцінах «Дваццаць дзён без вайны», «Палёты ў сне і наяве», «Вакзал для дваіх», «Пяць вечароў», «Сібірыяда»... Таксама Людміла Маркаўна стала аўтарам кніг «Маё дарослае дзяцінства» і «Апладысменты». У тэлеэфіры згадаць актрысу на наступным тыдні зможам на тэлеканалах «Беларусь 3» і на «Культуры».**



На сацыякультурным тэлеканале пакажуць фільм з удзелам Людмілы Гурчанкі «Раман і Франчэска» (1960) рэжысёра Уладзіміра Дзенісенкі. Кінастужка пераносіць гледача ў 1941 год і распавядае гісторыю сустрэчы марака і спявачкі, у каханне якіх умяшалася вайна. Савецкі гандлёвы карабель прыбывае ў італьянскі порт, дзе Раман чуе чароўны голас Франчэскі і ўлюбляецца ў дзяўчыну. А раніцай пачынаецца вайна. На зваротным шляху карабель топяць фашысты, аднак боцману і мараку ўдаецца ўратавацца. Яны становяцца ўдзельнікамі Супраціўлення. А пасля заканчэння вайны карабель Рамана зноў аказваецца ў знаёмым порце, аднак ці зможа хлопец знайсці за кароткі час каханую?

У эфіры канала «Культура» ў пятніцу 13 лістапада пакажуць фільм «Рэцэпт яе маладосці» (1983) рэжысёра Яўгена Гінзбурга. Мюзікл знялі на «Мосфільме» па матывах п'есы Карала Чапека «Сродак Макропуласа». Дзея кінастужкі адбываецца прыблізна ў пачатку ХХ стагоддзя. Знакамітая спявачка Эмілія Марці прыязджае на гастролі ў еўрапейскі горад.



Якраз у гэты ж час у вярхоўным судзе збіраюцца закрыць справу «Грэгар — Прус» — цяжбу, якая доўжыцца ўжо некалькі дзесяцігоддзяў. Альбер Грэгар беспаспяхова спрабуе адсудзіць сабе спадчыну барона Ёзафа Пруса, аднак не можа давесці, што з'яўляецца яго спадкаемцам. Эмілія нечакана ўмешваецца ў ход працэсу і паведамляе пра месцазнаходжанне дакументаў, якія даказваюць сваяцтва Грэгара і Пруса. Аднак, ведаць пра такое мог толькі блізкі чалавек, а ўлічваючы, што барон памёр каля ста гадоў таму, то напрошваецца шмат пытанняў, хто гэтая жанчына. Аказваецца, Эміліі больш за трыста гадоў, але, дзякуючы чароўнаму эліксіру алхіміка Макропуласа, выглядае яна толькі на 35...

Яшчэ для прыхільнікаў Людмілы Маркаўны на «Культуры» плануюць паказ выпуску праграмы «Лінія жыцця» з удзелам артысткі. Дзе яна расказвала пра сваё ваеннае дзяцінства, пра бацьку, ролі, якія давялося ўвасобіць на экране ў фільмах Эльдара Разанава і Уладзіміра Мяньшова, а таксама выконвала некаторыя са сваіх песень. «Я жыву і працую для вас, — казала тады артыстка. — Калі я ў кадры, я прадчуваю, як вы ўсміхнецеся ці заплачаце, гледзячы на экран. Калі выходжу на сцэну і чую вашы апладысменты — гэта для мяне як узлёт у неба, як узмах крылаў». Гурчанка была перакананая, што гады загартавалі яе: у іх былі заключаны перажыванні, якія потым увасобіліся ў вобразы жанчын, на чыю долю выпала шмат выпрабаванняў.

У нядзелю, 15 лістапада, «Культура» пакажа выпуск праекта «Рамантыка раманса», прысвечаны Людміле Гурчанцы — «Жыццё маё — кінематограф». У праграме прымаюць удзел Нона Грышаева, Ірына Клімава, Наталля Быстрова, Наталля Вінакурава і ансамбль пад кіраўніцтвам Ігара Тукалы.

**Алена ДРАПКО.**

## Беларусь 1

**6.00, 7.20, 8.15** Добрай раніцы, Беларусь!
**7.00, 8.00** (з сурдаперакладам), **9.00, 12.00, 13.00, 15.00, 17.00, 19.00** Навіны.
**7.05, 8.05** Навіны эканомікі.
**7.10, 8.10** Зона Х. Крымінальная хроніка (16+).
**9.10** Галоўны эфір.
**10.15** Навіны надвор'я.
**10.40, 12.10, 18.35, 19.20 Меладрама «Абое супраць смерці» (12+).**
**13.05, 15.25 Меладрама «Адваротны бок кахання». 1—4-я серыі (16+).**
**15.10, 18.00** Навіны рэгіёна.
**17.05** Беларуская часінка.
**18.15, 0.15** «Зона Х». Крымінальныя навіны (16+).
**21.00** Панарама.
**21.45** Зразумелая палітыка.
**21.55 Серыял «След» (16+).**
**23.55** Арэна.
**0.35** Дзень спорту.

## Беларусь 2

**7.00** «Уключайся!» (12+)
**9.00, 19.25** Тэлебарометр.
**9.05, 20.00** «Зразумець. Даравыць» (16+).
**10.15** Камень, нажніцы, папера (16+).
**11.00** «Да пабачэння» (16+).
**11.50 Фільм для ўсёй сям'і. «Так сабе вакацыі» (12+).**
**13.25** «Паненка-сялянка» (16+).
**14.20** «Арол і рэшка. Марскі сезон» (16+).
**15.15** Анімацыйны фільм «Горад герояў» (0+).
**17.05 Прыгоды «Піраты Карыбскага мора: мерцвякі не расказваюць казкі» (12+).**
**21.10** Спортлато 6 з 49, КЕНО.
**21.15** «Тата папаў» (16+).
**23.15** Хачу ў тэлевізар!
**23.20 Серыял «Анатомія страсці» (16+).**

## Беларусь 3

**7.00** «Дабраранак».
**7.35** «Беларуская кухня». Салодкі блін, бэзы і морс з журавін.
**8.05, 12.00, 20.20** Навіны культуры.
**8.25, 12.20** «Гэты дзень».
**8.30** «Нацыянальны хіт-парад».
**9.25** «Кадры жыцця». Аляксандр Карпаў.
**10.20, 18.40 «Кар'ера Дзімы Горына». Маст. фільм (12+).**
**12.25** «Беларуская кухня». Бураковы квас.
**12.55** «Наперад у мінулае».
**13.25, 21.40 «Фронт без флангаў». Маст. фільм (12+) [СЦ].**
**16.15** «Навукаманія» (6+).
**16.40 «Сэрцы чатырох». Маст. фільм (12+) [СЦ].**
**18.10** «Я хачу гэта ўбачыць!» (6+)
**20.40** «Калыханка» (0+).
**21.05** «Апошні дзень». Людміла Цалікоўская (12+).

## Беларусь 5

**7.00** Міні-футбол. Чэмпіянат Беларусі. ВРЗ (Гомель) — «Сталіца» (Мінск).
**8.55** Вынікі тыдня.
**9.40** Футбол. Чэмпіянат Беларусі. Агляд тура.
**10.25** Гандбол. Кваліфікацыя да ЧЕ–2022. Мужчыны. Латвія — Беларусь.
**12.00, 18.00** Плаванне. Ліга ISL.
**14.05** Вялікі спорт.
**14.50** Піт-стоп.
**15.20** Хакей. Кубак прэзідэнцкага спартыўнага клуба. Расія (U-16) — Расія (U-17).
**17.15** Вось гэта спорт!
**17.30** Футбол. Ліга Нацый УЕФА. Прэв'ю. Відэачасопіс.
**20.00, 22.15** Спорт-цэнтр.
**20.10** На грані фолу. Футбольны агляд.
**21.15** Футбол. Чэмпіянат Англіі. Агляд тура.
**22.25** Самба. Чэмпіянат свету.

## АНТ

**6.00, 7.15, 8.15** «Наша раніца».
**7.00** [СЦ], **8.00** [СЦ], **9.00** [СЦ], **11.00, 13.00, 16.00, 18.00** [СЦ], **20.30, 0.55** Нашы навіны.
**9.15** «Контуры».
**10.20** «Беларусь. Здабытак рэспублікі. Станцыя» (16+).
**11.15** «Модны прыгавор» (6+).
**12.15** «Грамадзянская абарона» (16+).
**13.15, 22.15 Серыял «Калі мінулае наперадзе» (16+).**
**15.05** «Давай пажэнімся!» (16+)
**16.20, 0.05** «Мужчынскае / Жаночае» (16+).
**17.20, 18.20** «На самай справе» (16+).
**18.50** «Удача ў прыдачу!» Дзённік (12+).
**18.55** «Няхай гавораць» (16+).
**20.00** Час.
**21.10 Серыял «Казанова» (16+).**

## СТБ

**6.00, 6.40, 7.45** «Раніца СТБ».
**6.30** [СЦ], **7.30** [СЦ], **8.30** [СЦ], **10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30** Навіны «24 гадзіны».
**8.40** «Тыдзень».
**10.40** «Як уладкаваны свет» (16+).
**12.15** «Вадзіць па-руску» (16+).
**12.40, 21.20** «Самыя шакавальныя гіпотэзы» (16+).
**13.45, 23.05** «Таямніцы Чапман» (16+).
**14.40, 20.30** «Неверагодна цікавыя гісторыі» (16+).
**15.30, 16.50 «Аперацыя Мухабат». Серыял (16+).**
**20.00, 22.55** «СТБ-спорт».
**20.05** «Сталічныя падрабязнасці».
**20.15** «Міншчына».
**22.05** «Глядзець усім!» (16+)
**23.55** «Загадкі чалавецтва» (16+).
**0.45** «Мінтранс» (16+).

## МІР

**5.00, 10.10, 3.30 Серыял «Дзяржаўная граніца» [СЦ] (12+).**
**10.00, 13.00, 16.00, 19.00, 0.00** Навіны (бягучы радок).
**13.15** «Справы судовыя. Грошы вярніце!» (16+)
**14.10, 17.15** «Справы судовыя. Бітва за будучыню» (16+).
**15.05, 16.15** «Справы судовыя. Новыя гісторыі» (16+).
**17.50, 19.25 Серыял «Адлюстраванне» [СЦ] (16+).**
**21.40** «Гульня ў кіно» (12+).
**22.25** Шоу «Назад у будучыню» (16+).
**23.25** «Сусветныя гульні розуму» (12+).
**0.15 Маст. фільм «Зялёны фургон» [СЦ] (12+).**
**2.45 Серыял «Мухтар. Новы след» [СЦ] (16+).**

## РТР—Беларусь

**6.05** «Новая раніца».
**11.00, 14.00, 17.00, 20.00** Весткі.
**11.30** «Пра самае галоўнае» (12+).
**12.35** «Спецыяльны рэпартаж».
**12.50** «У людзях з Вадзімам Шчагловым».
**13.35** «Плюс-мінус». Надвор'е на тыдзень.
**13.50, 16.50, 19.50, 23.00** Навіны — Беларусь.
**14.40 Серыял «Марозава» (12+).**
**17.15** «60 хвілін».
**18.35** «Андрэй Малахаў. Прамы эфір» (16+).
**21.00 Серыял «Бомба» (12+).**
**23.10** «Вечар з Уладзімірам Салаўёвым».

## НТБ—Беларусь

**6.10** «Астрапрагноз».
**6.15** Белавежская пушча (6+).
**6.30** Беларусы (6+).
**7.10** «Здароўе» (12+).
**8.00, 10.00, 13.00, 16.00, 19.00** Сёння.
**8.20** «Справа ўрачоў» (16+).
**9.05 Серыял «Мухтар. Новы след» (16+).**
**10.20** «Чакай мяне» (12+).
**11.15, 13.45 Баявік «Марскія д'яблы. Смерч» (16+).**
**13.20, 16.25** Агляд. Надзвычайнае здарэнне.
**14.45** Пракурорская праверка (16+).
**16.20, 19.35, 22.10, 23.35** Сёння. Галоўнае.
**16.50, 23.50** «ДНК» (16+).
**18.05, 19.50 Серыял «Пёс» (16+).**
**21.10 Драма «Чужы сярод сваіх» (16+).**
**22.15** «НЗ.by».
**22.30 Серыял «Груз» (16+).**

## 8 канал

**7.00, 15.50. 18.15, 21.05, 1.35** «Надвор'е» + «Эрана».
**7.05** «Мультпарад». «Казка пра рыбака і рыбку» (6+).
**7.30. 15.55, 20.50** «Прыколы 13-й школы» (6+).
**7.35 Серыял «Флэш» (12+).**
**8.20, 19.50 Серыял «МакМафія» (16+).**
**9.15** Стрым-спектакль «Казкі з куфра» (12+).
**10.00** М/ф «Скубі Ду» (12+).
**11.30 «Глядзім усёй сям'ёй». Меладрама «Харысты» (12+).**
**13.10 Серыял «Прывіды дома на ўзгорку» (16+).**
**14.20 Серыял «Непрыдуманая гісторыя» (16+).**
**16.00** «Мультпарад». «Дабрыня Мікіціч і Змей Гарыныч» (6+).
**17.15 Серыял «Рызыкоўны раман» (16+).**
**18.25 Серыял «Удава» (16+).**
**19.15** «Суперлато».
**20.55** «Вечарніца» (6+).
**21.10 Камедыя «Загадкавае забойства» (16+).**
**22.45 Трылер «Пастка» (16+).**
**0.40 Серыял «Хадзячыя мерцвякі» (18+).**



## ВТБ

**6.05** «Дурні і дарогі» (16+).
**7.45** «Лаві момант» (16+).
**9.10** «КВЗ. Па-нашаму» (16+).
**10.00** «Дзіцячы КВЗ» (6+).
**11.00** «Русkiя не смяюцца» (16+).
**12.05** «Галерэя прыгажосці» (16+).
**12.55** Анімацыйны фільм «Буслы» (6+).
**14.40** Анімацыйны фільм «Монстры на вакацыях-3: мора кліча» (6+).
**16.30** Фантастыка «Новы Чалавек-павук: высокае напружанне» (12+).
**19.15** Фантастыка «Макс Стыл» (12+).
**21.00** «Справа была ўвечары» (16+).
**22.05** «Пары на Канары» (16+).
**23.05** «Дзеткі-продкі» (12+).
**0.10** «Уральскія пельмені» (16+).
**1.30** «Рогаў у справе» (16+).
**2.25** «Проста кухня» (16+).
**2.55** «Даеш моладзь» (16+).
**4.40** «6 кадраў» (16+).

## Культура

**6.30** «Брыдкае качаня». «Казка пра рыбака і рыбку». «Храбры кравец». Мультфільмы.
**8.00** «Багатая нявеста». Маст. фільм [СЦ].
**9.25** «Звычайны канцэрт».
**9.55** «Мы — грамацеі!»
**10.35** «Утаймаванне свавольнай». Маст. фільм.
**12.35** Лісты з правінцыі. Стаўраполле [СЦ].
**13.05, 2.05** Дыялогі пра жывёл. Заапарк Растова-на-Доне [СЦ].
**13.50** «Іншыя Раманавы». «Зорка з Усходу» [СЦ].
**14.20** «Калекцыя». Дак. серыял [СЦ].
**14.50** «Гульня ў бісер».
**15.30, 0.20** Ілюзіён. «Трапецыя». Маст. фільм.
**17.15** Астравы. Давід Самойлаў [СЦ].
**18.00** «Пешшу...» Дарога на Кашыру [СЦ].
**18.35** «Рамантыка рамансa». Людміле Гурчанцы прысвячаецца...
**19.30** Навіны культуры.
**20.10** «Вершнік па імені смерць». Маст. фільм [СЦ].
**21.55** Шэдэўры сусветнага музычнага тэатра. Балет П. І. Чайкоўскага «Лебядзінае возера». Пастаноўка Каралеўскага тэатра Ковент-Гардэн. Харэаграфія М. Пеціпа і Л. Іванова.
**2.45** «Эксперымент». Мультфільм для дарослых.

## Настальгія

**6.00** «Да і пасля...» Год 1973-і (12+).
**7.05, 8.50, 9.45, 11.00, 20.40, 1.00, 2.20, 3.45, 5.00** Музычная настальгія (12+).
**7.20, 1.20** Маст. фільм «Вязень замка Іф» (16+).
**9.00, 15.00, 21.00, 3.00** «Мінулы час» (12+).
**10.00** «Колба часу» (16+).
**12.00** Маст. фільм «Блізняты» (12+).
**13.25** «Прызнанне ў каханні». Святочны канцэрт (12+).
**15.00** «Быў час». 2008 год (16+).
**16.00** Маст. фільм «І паўторыцца ўсё» (16+).
**17.20** «Рок-н-рол ТБ». Канцэрт гурта «Ліга блюза» ў Тэатры эстрады (16+).
**18.00** Тэлеспектакль «Астравы ў акіяне» (16+).
**22.00** Маст. фільм «Забудзьцеся словa «смерць» (16+).
**23.20** Дак. фільм «Фільм пра фільм. Я крочу па Маскве» (12+).
**0.00** «Ялова субмарына»: «Гісторыя рускага рока». «Аляксей Хвасценка» (16+).
**4.00** «Народжаны ў СССР».

## EuroSport 1

**0.05** Снукер. English Open (6+).
**1.30, 12.00, 22.00** Тэніс. WTA (6+).
**3.30** Тэніс. «Ралан Гарос» (6+).
**5.00, 9.00** Горныя лыжы. Кубак свету (12+).
**7.00, 18.00, 23.00** Снукер. Northern Ireland Open — 2019 (6+).
**10.30, 14.00** Аўтагонкі. WTCR (12+).
**19.00** Веласпорт (трэк). Чэмпіянат Еўропы (12+).

## Кінакамедыя

**0.00** Паслявясельны разгром (18+).
**1.45** 2 + 1 (16+).
**4.20** Шалёныя суседзі (16+).
**6.00** Нягледзячы ні на што (16+).



**8.10** Укрaдзі маю жонку (16+).
**10.00** Эдзі (12+).
**11.55** Целаахоўнік Тэс (12+).
**13.50** Замуж на два дні (12+).
**15.50** Каханне з паведамленнем (16+).
**17.45** Ліцэнзія на шлюб (12+).
**19.30** Дзюплекс (12+).
**21.05** Каханне і іншыя лекі (16+).
**23.15** Хлапечнік у Еўропе (18 +).

## ТБ3

**6.00** Калекцыя «Беларусьфільма» (12+).
**7.45** «Улегцы» (12+).
**8.20** Калекцыя «Беларусьфільма»: «Рыжык у Залюстроўі». Маст. фільм (16+).
**10.35** «Выратуйце, я не ўмею гатаваць!» (12+)
**11.25, 2.40** Серыял «Удзельнік лейтэнанта Качуры» (12+).
**15.40** Анімацыйны фільм «Воблачна, магчымы ападкі» (6+).
**17.15** Серыял «Далікатная зіма» (16+).
**21.45** «ТБ3 вядзе расследаванне» (16+).
**22.50** Маст. фільм «Хуткасць-2» (12+).
**1.10** «Грым». Серыял (16+).

## ТБ1000

**6.55** Давайце патанцуем (12+).
**9.05** Восень у Нью-Ёрку (12+).



**10.55** Парк Юрскага перыяду (16+).
**13.10** Парк Юрскага перыяду-2: закінуты свет (16+).
**15.30** Парк Юрскага перыяду-3 (16+).
**17.05** Добра быць ціхоняй (16+).
**19.00** Як адчапіцца ад хлопца за 10 дзён (12+).
**21.05** Добрай раніцы (16+).
**23.00, 5.00** Пампушка (16+).
**1.00** Апантанасць (18+).
**3.05** Шчаслівы выпадак (12+).

## ТБ1000 Рускае кіно

**7.15** Пасажырка (16+).
**9.00** Калектар (16+).
**10.15** Урфін Джус вяртаецца (6+).
**11.35** Джэнтльмены, удачы! (12+)
**13.20** Ласкавы май (12+).
**15.30** Гараскоп на ўдачу (12+).
**17.10** Золушка (16+).



**19.00** Лёгкі на ўспамін (12+).
**20.30** Дублёр (16+).
**22.00** Адной левай (12+).
**23.30** Кіроўца для Веры (16+).
**1.30** Ваўкалакі (16+).
**2.50** Кантрыбуцыя (12+).

## National Geographic

**6.00** Зрабіць за адзін дзень (16+).
**6.25** Аўта-SOS (16+).
**8.05** Суперкар са сметніка (16+).
**9.50** Каралі рыбалкі 1 (16+).
**11.35** Машыны: разабрaць і прадаць (16+).
**13.15** Сапраўдны суперкар (16+).
**14.55** Мегамасты (16+).
**15.50** Катастрофа ў рэальным часе (16+).
**16.40** Секунды да катастрофы (16+).
**19.20** Сведкі катастроф (16+).
**21.00** Адраджэнне Парадайса (16+).
**22.55** Стварэнне Райскага вострава (16+).
**23.45** Варожая планета (16+).
**1.35** Інстынкт выжывання (16+).
**2.00, 5.15** Асушыць акіян: глыбокае апусканне (16+).
**3.35** Нацыянальныя паркі Амерыкі (16+).

## Discovery

**8.00** Махінатары (12+).
**8.45, 21.02** Як гэта ўладкавана: аўтамабілі мары (12+).
**9.10, 5.42** Смяротны ўлоў (16+).
**10.00** Залатая ліхаманка (16+).
**11.41** Як уладкваны Сусвет (12+).
**13.23, 23.09** Дальнабойшчык у Афрыцы (12+).
**14.14, 7.14** Паляўнічыя на дыназаўраў (12+).
**15.05** Браты Дызель (12+).
**15.56** Геній аўтадызайну (12+).
**19.20** Як гэта ўладкавана? (12+)
**20.11** Як гэта зроблена? (12+)
**21.27** Голыя і напалоханыя (16+).
**0.00, 6.28** Вартавыя падземкі (16+).
**0.51** Аляска: 100 дзён выжывання (16+).
**1.42** Паляўнічыя на склады (16+).

*У праграме магчымы змяненні.*
*Перадрукоўка праграмы забаронена.*
*[СЦ] – фільм трансліруецца са скрытымі субцітрамі.*

## Беларусь 1

**6.00, 7.20, 8.15** Добрай раніцы, Беларусь!
**7.00, 8.00** (з сурдаперакладам), **9.00, 12.00, 13.00, 15.00, 17.00, 19.00** Навіны.
**7.05, 8.05** Навіны эканомікі.
**7.10, 8.10** Зона Х. Крымінальная хроніка (16+).
**9.10, 21.45 Серыял «След» (16+).**
**10.50, 12.10, 18.35, 19.20 Меладрама «Адплата». 1-2-я серыі (16+).**
**13.05, 14.45, 15.25 Меладрама «Сонечны лістапад» (16+).**
**14.00** «Здарова здаровым быць!» (6+) [СЦ].
**15.10, 18.00** Навіны рэгіёна.
**17.05** Беларуская часінка.
**18.15, 0.00** «Зона Х». Крымінальныя навіны (16+).
**21.00** Панарама.
**23.45** Сфера інтарэсаў.
**0.25** Дзень спорту.

## Беларусь 2

**7.00** «Уключайся!» (12+)
**9.00, 18.15** Тэлебарометр.
**9.05, 20.00** «Зразумець. Дараваць» (16+).
**9.45, 20.40** «Сямейныя гісторыі» (16+).
**10.15, 22.30** «Экстрасэнсы-дэтэктывы» (16+).
**11.20, 18.20 Прэм'ера. Серыял «Браты па крыві» (16+).**
**13.00, 23.35 Серыял «Анатомія страсці» (16+).**
**13.50** «Свет навыварат. Бразілія» (16+).
**14.50** Анімацыйна-прыгодніцкі серыял «Стыч!» (6+)
**15.40** Нічога сабе ньюз (12+).
**15.45** «ПІН_КОД» (12+).
**16.30 «Не нарадзіся прыгожай». Серыял (12+).**
**17.20** «Арол і рэшка. Марскі сезон» (16+).
**21.10** Спортлато 6 з 49, КЕНО.
**21.20** «Трэці лішні» (16+).

## Беларусь 3

**7.00** «Дабраранак».
**7.35, 12.20** «Беларуская кухня». Верашчака.
**8.05, 12.00, 20.20** Навіны культуры.
**8.25** «Гэты дзень».
**8.30, 18.00 «Жыццё і Лёс». Серыял. Фільм першы (16+).**
**9.55** «Люблю і памятаю». Аркадзь Райкін.
**10.40, 16.20 «Грыбны дождж». Маст. фільм (12+) [СЦ].**
**12.50, 21.05** «Апошні дзень». Алег Барысаў (12+).
**13.30, 21.40 «За двума зайцамі». Маст. фільм (12+) [СЦ].**
**14.45** «Сваімі словамі». Тэлевіктарына.
**15.25** Канцэрт «Славянскі базар у Віцебску — 2018».
**17.35** «Дом, дзе жыве мастацтва». Дак. фільм.
**19.30** «Ваша лато», «Пяцёрачка».
**20.00** «Суразмоўцы». Мікола Яцэвіч.
**20.40** «Калыханка» (0+).
**23.05** «Рэвалюцыя 1917. Эпоха вялікіх перамен». Дак. фільм «Чырвоныя імператрыцы» (16+).
**23.30** «Архітэктура Беларусі» [СЦ].

## Беларусь 5

**7.00** Спорт-мікс.
**7.10, 12.00, 18.00** Плаванне. Ліга ISL.
**9.15** На грані фолу. Футбольны агляд.
**10.20** Футбол. Чэмпіянат Англіі. Агляд тура.
**11.15** Футбол. Ліга чэмпіёнаў УЕФА. Відэачасопіс.
**11.50** Азбука спорту.
**14.05** Хакей. Кубак прэзідэнцкага спартыўнага клуба. Беларусь (U-18) — Беларусь (U-17).
**16.15** Футбол. Кваліфікацыя да ЕЎРА-2020. Прэв'ю. Відэачасопіс.
**16.50** Спорт-кадр.
**17.25** Матч-пойнт.
**20.00** Хакей. Чэмпіянат Беларусі. ХК «Гомель» — «Нёман» (Гродна). (У перапынках — Спорт-цэнтр.)
**22.00** Баскетбол. Ліга чэмпіёнаў. «Більбаа» (Іспанія) — «Бамберг» (Германія). (У перапынку — Спорт-цэнтр.)

## АНТ

**6.00, 7.20, 8.20** «Наша раніца».
**7.00** [СЦ], **8.00** [СЦ], **9.00** [СЦ], **11.00, 13.00, 16.00, 18.00** [СЦ], **20.30, 0.55** Нашы навіны.
**9.15** «Тэорыя змовы» (16+).
Аднак гэтыя людзі едуць дадому не з пустымі рукамі. Яны ўжо набылі, лічаць эксперты, як негатыўны, так і станоўчы досвед вялікага горада, у іх ёсць пэўны багаж ведаў і кваліфікацыя. Яны ўжо здольныя шукаць канкрэтныя шляхі паляпшэння якасці ўзроўню мясцовага жыцця. Верагодна, такім чынам, пандэмія можа даць істотны імпульс развіццю малых гарадоў.

На погляд экспертаў, перавагі невялікіх гарадоў відавочныя. Менавіта там адкрываюцца магчымасці для фарміравання канкурэнтаздольнай рабочай сілы, стварэння ўмоў для аддаленай работы, развіцця тэлекамунікацый, авалодання камп'ютарнымі навыкамі. Вялікая перавага і ў тым, што малыя і сярэднія гарады могуць даць людзям камфортнае асяроддзе, пастаянную і прыемную сувязь з прыродай, даступныя гарадскія сэрвісы. І пры гэтым дазваляюць працаваць дыстанцыйна, вядома, пры наяўнасці адпаведнай інфраструктуры.

У адрозненне ад мегаполісаў малыя гарады, наадварот, узмацняюць сувязі паміж членамі мясцовых супольнасцяў, даюць магчымасці для новых знаёмстваў, актыўней далучацца да тых працэсаў, якія адбываюцца ў гэтых гарадах. Там з'яўляецца шмат мясцовых энтузіястаў, нараджаюцца новыя праекты, узнікаюць малыя вытворчасці і г. д. Запыт на такія кантакты для жыхароў буйных гарадоў узрастае.

## Штуршок для роздуму

Дарэчы, матэрыялы для гэтай публікацыі далі эксперты «Зялёных гарадоў» — міжнароднага праекта Глабальнага экалагічнага фонду і ПРААН, які ўжо не першы год паспяхова працуе з мясцовымі ўладамі нашых рэгіёнаў. Супрацоўнікі праекта ўпэўненыя, што малыя гарады Беларусі маюць высокі патэнцыял для таго, каб стаць жаданым месцам жыцця. Толькі вось як яго рэалізаваць?

Сітуацыя з COVID-19 — гэта і штуршок для роздуму над тым, як прывесці ў адпаведнасць з рэаліямі часу састарэлую сістэму мясцовага кіравання і самакіравання, пра неабходнасць глыбокага рэфармавання якой сёння праходзяць гарачыя дыскусіі на дыялогавых пляцоўках. Цікавых прапаноў і прагнозаў на найбліжэйшую і на далёкую перспектыву шмат.

Хто толькі незаклапочаны гэтай тэмай. Вядома, усім на месцах не хапае сродкаў на розныя карысныя справы. Толькі дзе ўзяць свабодныя мільёны?

Сярод тых, хто мае права нешта параіць, на мой погляд, эксперты «Зялёных гарадоў». Яны пастаянна аналізуюць вялікія аб'ёмы інфармацыі па сучасным горадабудаўніцтве менавіта невялікіх населеных пунктаў, акумулююць замежны досвед, раяць шляхі яго выкарыстання.

Праз пандэмію сацыяльныя кантакты моцна звузіліся. Экспертам праекта стала складаней асабіста ўдзельнічаць у рабоце мясцовых груп. З гэтай нагоды праектам быў створаны відэакурс «Распрацоўка плана зялёнага горадабудаўніцтва», які можа дапамагчы мясцовым адміністрацыям, напрыклад, у самастойным пошуку новых падыходаў і рэсурсаў для развіцця сваіх тэрыторый.

**Леанід ЛАХМАНЕНКА.**

КАБ ПАМЯТАЛІ...

# У памяць пра лётчыкаў

**Каля вёскі Лібярполь Пружанскага раёна, што на Брэстчыне, усталявана шыльда ў гонар экіпажа самалёта, які загінуў у першыя дні вайны. Рэшткі збітага самалёта «СБ-2» актывісты пошукавага атрада «Авіяпошук» знайшлі яшчэ восенню 2018 года.**




«СБ-2» — лёгкі савецкі бамбардзіроўшчык трыццатых гадоў мінулага стагоддзя. У першыя дні вайны такія самалёты выкарыстоўвалі ў тым ліку і для разведкі.

На жаль, імёнаў членаў экіпажа ўстанавіць не ўдалося. Мяркуецца, што яны загінулі ў першыя дні вайны. Траекторыя падзення і вялікая плошча, на якую разляцеліся фрагменты машыны, даюць падставу меркаваць, што экіпаж спрабаваў зрабіць вымушаную пасадку, але не змог, і самалёт літаральна ўрэзаўся ў зямлю.

Галоўнае, што памяць не страчаная — у нас умеюць шанаваць і безыменных герояў. Жыхары Зеляневіцкага сельсавета сабралі грошы і прафінансавалі выраб шыльды, якая стала данінай памяці людзям, што аддалі жыцці за Радзіму.

**Святлана ЯСКЕВІЧ.**
**Фота з сайта газеты «Раённыя будні».**

# Шанаваць гісторыю

**У Лёзненшчыне на месцы былой царквы адкрылі каплічку і перапахавалі астанкі амаль сарака вызваліцеляў раёна.**

Як высветлілі краязнаўцы і даследчыкі тэмы архітэктурнай спадчыны Беларусі, Стасеўскі праваслаўны храм Пакрова Прасвятой Багародзіцы быў пабудаваны 160 гадоў таму.

У 1860 годзе царква ўяўляла з сябе драўляны будынак на каменным падмурку. Дах вянчалі два купалы з пяццю званамі, самы вялікі важыў больш за 300 кг. У царкве захоўваўся архіў. У канцы 1930-х яна была зачынена...

А ў вёсцы Вялікае Сяло нядаўна перапахавалі астанкі каля сарака вызваліцеляў раёна. Іх знайшлі падчас правядзення палявых пошукавых работ вайскоўцы 52 асобнага спецыялізаванага пошукавага батальёна.

У жалобнай цырымоніі ўзялі ўдзел прадстаўнікі абласной прадстаўнічай і выканаўчай улады Віцебшчыны і раёна, а таксама з Чувашыі. Афіцыйная дэлегацыя з гэтага рэгіёна Расіі прыехала па просьбе сваякоў аднаго з загінулых, каб адвезці астанкі земляка для пахавання на Радзіме.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ .**

НОВЫ ЎЛАСНІК

# З МАЛАТКА!

## Прададзены адзін з архітэктурных сімвалаў малой радзімы Шагала

**У цэнтры Віцебска на аўкцыёне рэалізавалі былы клуб металістаў, помнік архітэктуры пачатку 1930-х гадоў. Ён знаходзіцца недалёка ад чыгуначнага вакзала на беразе Заходняй Дзвіны.**

Як паведамілі «Звяздзе» ў камітэце «Віцебскаблмаёмасць», за апошнія пяць гадоў гэты аб'ект нерухомасці пятнаццаць разоў спрабавалі прадаць «з малатка». І ў тым ліку дзесяць разоў выстаўлялі на электронныя таргі. Пачатковы кошт, па якім можна было купіць будынак, быў вызначаны ў памеры больш за 687 тысяч рублёў, што складала на той час 578 тысяч долараў. Але пакупнікоў не знайшлося нават на чатырох абвешчаных аўкцыёнах за базавую велічыню...

Нядаўні аўкцыён быў паспяховы. На гэты раз знайшліся адразу тры пакупнікі. Цана падчас таргоў павялічылася з чатырох базавых велічынь (108 рублёў) да каля 131,5 тысячы рублёў. Былы клуб металістаў быў прададзены прыватнай будаўнічай кампаніі з Віцебска.

У бліжэйшыя тры гады новаму ўласніку давядзецца правесці рэканструкцыю будынка, не змяняючы яго вонкавае аблічча, захоўваючы яго як каштоўны гісторыка-культурны аб'ект, удакладнілі ў камітэце.

Па ўмовах продажу магчыма стварэнне ў былым клубе культурна-асветніцкага альбо забаўляльнага аб'екта.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**

РАЗВІЦЦЁ

# Толькі разам, талакой

**Генеральны план, а таксама ўдзел грамадзян у рашэнні пытанняў развіцця тэрыторый абмеркавала на днях кіраўніцтва Бараўлянскага сельвыканкама са сваім актывам.**

**Старшыня сельвыканкама Жанна ВАРАБЕЙ** адзначыла, што за апошнюю пяцігодку ў рэгіёне шмат зроблена: пабудавана дзве сярэднія школы, шэсць дзіцячых садоў. Гэта дазволіла даць месцы ў дашкольнай установе тым, хто меў у гэтым патрэбу, а таксама значна скараціць чаргу.

Генеральным планам прадугледжана далейшае добраўпарадкаванне, азеляненне, стварэнне зон адпачынку, узвядзенне новых аб'ектаў. У прыватнасці, у 2021 годзе пачнецца будаўніцтва корпуса новай паліклінікі, якая зможа прыняць 800 чалавек у змену. Ужо распрацавана праектна-каштарысная дакументацыя і вядуцца пошукавыя работы. Бараўляны таксама маюць патрэбу ў мадэрнізацыі інжынерных камунікацый. За кошт сродкаў Міжнароднага банка рэканструкцыі і развіцця заканчваецца будаўніцтва магутнай кацельні, уладкоўваецца дарожная сетка.

Па словах Жанны Варабей, многае зроблена з удзелам грамадзян. У 2018—2019 годзе дзякуючы прыватна-дзяржаўнаму партнёрству будаваліся дарогі ў населеных пунктах Чарцяж, Вопытны, Лескаўка. Па ініцыятыве насельніцтва праводзяцца суботнікі. Асабліва гэта датычыцца жыхароў вёсак Курганы, Каралёў Стан, пасёлка Вопытны. Стараннямі жыхароў з'явіліся месцы адпачынку ў раёнах прыватнай жылой забудовы Дроздава, Лескаўкі. Тут уладкаваны дзіцячыя спартыўныя пляцоўкі.

**Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ.**

# Адзін з 231-го!



## Мікіта Хрушчоў у гарсавеце дэпутатаў. І лазні... без мыла, але з напоямі

**«МС» працягвае знаёміць сваіх чытачоў з архіўнымі дакументамі, якія друкуюцца на афіцыйнай старонцы Гродзенскага гарсавета дэпутатаў і ў яго Тэлеграм-канале — усе гэтыя матэрыялы нагадваюць аб пакручастай гісторыі абласнога цэнтра ў няпростыя пасляваенныя, складаныя пяцідзясятыя і стваральныя шасцідзясятыя гады мінулага стагоддзя. З якой нагоды мы гэта робім? Сёлета Гродзенскі гарадскі Савет дэтутатаў адзначае свой 80-гадовы юбілей.**

### Паплечнік правадыра

Вясной 1953 года адбыліся выбары ў гарадскі Савет дэпутатаў працоўных чацвёртага склікання. Са справаздачы мандатнай камісіі аб выніках выбараў даведваемся, што «ў склад дэпутатаў абраны найбліжэйшы паплечнік і вучань таварыша Сталіна — Мікіта Сяргеевіч Хрушчоў». Трэба сказаць, што ў той час дэпутацкі корпус горада налічваў 231 дэпутата. Што ён тут забыў, задасца пытаннем чытач? Адкажам: на той час гэта было традыцыяй — прадстаўнікоў вышэйшых органаў кіравання вылучаць у склад прадстаўнічай улады на месцах. Такі крок, безумоўна, рабіўся нездарма — усё вырашалася на палітычным алімпе. Тым больш што памежны Гродна меў стратэгічнае значэнне для кіраўніцтва краіны Саветаў. Дарэчы, высветліўся цікавы факт: планы па вылучэнні дэпутатам гарсавета былі адносна самога Сталіна, але... прывядзём некалькі цытат са справаздачы мандатнай камісіі без скарачэнняў (каб адчуць усю патэтыку таго моманту):

*«Працоўныя горада на перадвыбарных сходах першым кандыдатам у дэпутаты гарадскога Савета вылучалі вялікага з найвялікшых, лепшага з найлепшых — правадыра і настаўніка, роднага бацьку Савецкага народа і ўсяго прагрэсіўнага чалавецтва Іосіфа Вісарыёнавіча Сталіна.*

*Зараз, калі ўвесь Савецкі народ, усе працоўныя панеслі найцяжэйшую страту — скон вялікага правадыра, сябра і настаўніка Іосіфа Вісарыёнавіча Сталіна, доўг кожнага дэпутата, як і ўсіх савецкіх людзей, цвёрда ісці па шляху, намечаным вялікім Сталіным, свята выконваць яго запаветы, аддаць усе свае сілы і веды на карысць любімай Радзімы, яшчэ больш шчыльна з'ядначацца вакол ЦК КПСС, нашага роднага Савецкага Урада.*

*Працоўныя горада ганарацца тым, што ў склад дэпутатаў Гродзенскага гарадскога Савета дэпутатаў працоўных абраны найбліжэйшы паплечнік і вучань таварыша Сталіна — Мікіта Сяргеевіч Хрушчоў».*

Ці быў сам Хрушчоў падчас абрання ў Гродне, з архіўнага дакумента не вынікае. З гісторыі вядома, што ён не раз бываў у Беларусі, дзе любіў адпачыць і папаляваць на дзікую жывёлу. Атрымліваецца, што абранне ў склад гарсавета дэпутатаў папярэднічала статусу Генсека ЦК КПСС, бо на гэтую пасаду ён быў вылучаны толькі ў верасні 1953 года і кіраваў вялікай краінай Саветаў аж да 1964-га.

> У сучасных гараджан патрэба ў мочаных яблыках і салёных грыбах, можа, і засталася, а вось з хрэнам справы з цягам часу наладзіліся — зараз яго на гандлёвых паліцах колькі заўгодна.

Пацікавіліся мы і тым, хто яшчэ трапіў у склад тагачаснага гарсавета. Як высветлілася, з 231 дэпутата большасць — гэта мужчыны, іх колькасць складала 161 чалавек. Таксама сярод народных абраннікаў пераважная большасць служачыя — 164 чалавекі, астатнія 67 дэпутатаў — рабочыя. Па ўзроўні адукацыі сто чалавек мелі незакончаную сярэднюю і пачатковую адукацыю, вышэйшую — толькі 50 чалавек. Узроставая лінейка таксама была разнастайная (да 24 гадоў — 17 чалавек, ад 50 і вышэй — 45 дэпутатаў), як і сфера прафесійнай дзейнасці (ад кіраўнікоў партыйных і савецкіх арганізацый да навучэнцаў вышэйшых і сярэдніх устаноў адукацыі).

Цікавы і нацыянальны складнік: у шматнацыянальным горадзе сярод народных абраннікаў былі, натуральна, беларусы (123), рускія (82), украінцы (16), яўрэі (3), палякі (2), татары (2), армяне (1), латышы (1) і карэлы (1).

Справаздачу мандатнай камісіі зацвердзілі на першай сесіі гарадскога Савета дэпутатаў працоўных чацвёртага склікання.

### Прыхільнікам пары

Пагарталі мы і першыя рашэнні таго склікання. Напрыклад, на адной з сесій народным абраннікам даводзілі сітуацыю з падрыхтоўкай горада да зімовага перыяду. І калі цяпер на парадку дня больш знаходзяцца пытанні апрацоўкі вуліц адмысловымі сумесямі ад галалёдзіцы, то на той час улады горада непакоіў запас паліва, у тым ліку і для лазняў. Гэта цяпер лазня ўспрымаецца як нейкае захапленне, а ў 50-я гады мінулага стагоддзя гаворка ішла аб штотыднёвых



санітарна-гігіенічных працэдурах гараджан — мыліся ж усе тады ў лазні!

*«Усе лазні, як першая, так і другая часткова рэканструяваны, цалкам адрамантаваны. Назапашана паліва на зімовы перыяд і захоўваецца на складах. Можна запэўніць смела, што лазні № 1 і № 2 палівам забяспечаны да чэрвеня месяца 1954 года»,* — рапартавалася ў дакладзе. — *«Разам з вялікай работай, якая была праведзена, лазні яшчэ цалкам не забяспечваюць патрэбу працоўных горада неабходнымі паслугамі. Яшчэ адсутнічае запатрабаванае санітарнае становішча, нізкая культура абслугоўвання персаналу. У лазні ёсць гандлёвы пункт, які прапануе толькі спіртныя напоі, а калі працоўны захоча набыць мыла, мачалку, зубную шчотку, там гэтага няма. Дырэктару патрэбна прыслухаццца да скаргаў працоўных і пераарыентаваць работу на карысць справы».*

> Атрымліваецца, што абранне ў склад гарсавета дэпутатаў папярэднічала статусу Генсека ЦК КПСС.

*Дакументам таксама прапануецца адказнаму работніку гарвыканкама арганізаваць гандаль у лазнях таварамі, звязанымі з санітарным абслугоўваннем гараджан: «У лазні № 1 няма ніякага шапіка для продажу напояў, неабходна гэтаму пытанню неадкладна аддаць сур'ёзную ўвагу».*

Працягваючы тэму гандлю і непасрэдна напояў, у адным з дакументаў таго часу чытаем: *«Гандаль у горадзе сезоннымі таварамі (як садавіна, агародніна, бульба, марожанае) арганізаваны слаба. Продаж піва і ахаладжальных напояў арганізаваны дрэнна. У зімовы перыяд часта не бывае піва ў падагрэтым выглядзе, а летам — у ахаладжаным».*

З тае пары мінула амаль сем дзясяткаў гадоў, а пеннага напою ў падагрэтым выглядзе нават і не ведаю, дзе ў Гродне можна пакаштаваць зімой...

### Выпіць, а закусіць?

Асобна хацелася б спыніцца на такім забытым паняцці як дзяржплан. На сесіях народным абраннікам падрабязна расказвалі аб поспехах і хібах яго выканання. Лідарамі былі перапрацоўшчыкі аграпрамысловай прадукцыі: вытворцы мясной і малочнай прадукцыі, іншых харчовых тавараў, таксама лёгкай прамысловасці і некаторыя іншыя. Але ж цікавасць выклікае не гэта, а інфармацыя аб тых, хто той самы дзяржплан не выканаў і чаму.

Напрыкалад, чытаем: *«Гархарчакамбінат летась спрацаваў вельмі дрэнна, нягледзячы на тое, што вытворчую праграму па валавой прадукцыі выканаў на 121 %. Што забяспечыла гэты высокі працэнт перавыканання плана? А вось што! Ёсць у Гархарчакамбіната «канёк», які заўсёды яго вывозіць — гэта вытворчасць пладова-ягаднага віна. Дарэчы, у ім няма ніякай патрэбы пры наяўнасці ў горадзе вінзавода. А як справы з выкананнем плана па іншых відах тавараў? Вось напрыклад, па засолцы гуркоў план выкананы на 1,2 %. Саленнем капусты, таматаў, сушкай пладоў і ягад абсалютна не займаліся. Не займаліся пастэрызацыяй сокаў. Не выкананы план па марынаванні і засолцы грыбоў, вырабе сталовага хрэну, мочаных яблыкаў і іншага. Ва ўсіх гэтых вырабах насельніцтва мае вострую патрэбу. З 18 запланаваных вырабаў план не выкананы на 12, ці ж можна прызнаць такую работу здавальняючай? Канешне, не!»* — запэўніваюць аўтары даклада.

Трэба сказаць, што ў сучасных гараджан патрэба ў мочаных яблыках і салёных грыбах, можа, і засталася, а вось з хрэнам справы з цягам часу наладзіліся — зараз яго на гандлёвых паліцах колькі заўгодна і на сталах гаспадынь ён наўрад ці перавядзецца.

Працяг будзе.

**Вольга АНУФРЫЕВА.**



МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ
ГАЗЕТА ДЛЯ ВЫБАРШЧЫКАЎ І ДЭПУТАТАЎ МЯСЦОВЫХ САВЕТАЎ

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ № 15 ад 17 лютага 2009 года выдадзена Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.
**Заснавальнікі:** Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

**Выдавец — рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда»**

**Дырэктар — галоўны рэдактар КАРЛЮКЕВІЧ АЛЯКСАНДР МІКАЛАЕВІЧ.**

**Адказны за выпуск: АНУФРЫЕВА В. А.**

www.zviazda.by

e-mail: info@zviazda.by
(для зваротаў): zvarot@zviazda.by

**АДРАС РЭДАКЦЫІ:**
220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10а.
**КАНТАКТНЫ ТЭЛЕФОН** 311 17 35;
**e-mail:** info@zviazda.by

**Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 03.04.2009. 220013, г. Мінск, праспр. Незалежнасці, 79/1.**

**Тыраж 14.804.** **Нумар падпісаны ў 19.30 5 лістапада 2020 года.**

# КРЫВАВАЯ ВОСЕНЬ

## Чаму Еўропу апанаваў тэрарызм?



**Тэракты ў гарадах Францыі і Вене не прымусяць Еўропу адмовіцца ад сваіх фундаментальных каштоўнасцяў. Пра гэта заявіў першы намеснік міністра замежных спраў Грэцыі і старшыня Камітэта міністраў Савета Еўропы (СЕ) Мільтыядыс Варвіцыётыс на адкрыцці 130-й сесіі камітэта ў Афінах. Крывавы тэракт у Вене стаў сведчаннем таго, што экстрэмісты пагражаюць не толькі Францыі, але і іншым еўрапейскім краінам, адзначыла dw.com. І не толькі — гэта насамрэч глабальная пагроза. «Ісламісцкі тэрарызм аб'ядналы ў сеткі па ўсім свеце і аднолькава небяспечны ўсюды. Перад Еўропай стаіць агульны выклік, які мы можам вырашыць толькі разам», — адзначыў аўстрыйскі канцлер Себасцьян Курц падчас выступлення перад Нацыянальным саветам Аўстрыі, паведаміла РІА «Навіны». Чаму Стары Свет апанаваў тэрарызм і чым гэта пагражае ў глабальным маштабе?**

### Трагічны час

Гэты тыдзень пачаўся з крывавых падзей у аўстрыйскай сталіцы. Увечары ў панядзелак у людным венскім квартале «Бярмудскі трохвугольнік» паблізу цэнтральнай сінагогі і Венскай оперы злачынец страляў па мінаках. Загінулі чатыры чалавекі: двое мужчын і дзве жанчыны. Раненні атрымалі яшчэ 22 чалавекі, у тым ліку адзін паліцэйскі.

Нападзенне ў Вене адбылося ўсяго праз некалькі дзён пасля шэрагу ісламісцкіх тэрактаў у Францыі. 16 кастрычніка ў Парыжы злачынец напаў з нажом на 47-гадовага настаўніка гісторыі і геаграфіі Самюэля Паці, забіў яго і адрэзаў галаву. 29 кастрычніка ў выніку нападзення ўзброенага нажом тэрарыста загінулі тры наведвальнікі базілікі Нотр-Дам у Ніцы і яшчэ шэсць чалавек былі паранены. А праз два дні, 31 кастрычніка, невядомы адкрыў агонь перад грэчаскай праваслаўнай царквой у Ліёне і параніў святара.

Таксама паліцэйская служба Еўрасаюза Europol паведаміла пра раскрыццё буйной сеткі ісламістаў на тэрыторыі ЕС. Іспанскай паліцыі ўдалося выявіць на поўначы краіны ячэйку джыхадыстаў, якія займаліся падрыхтоўкай тэрактаў ад імя тэрарыстычнай групоўкі «Ісламская дзяржава». «Ячэйка актыўна распаўсюджвала ў інтэрнэце джыхадысцкую прапаганду з мэтай вярбоўкі і ідэалагічнай апрацоўкі маладых людзей», — адзначаецца ў паведамленні Europol. Па звестках ведамства, у некаторых са шматлікіх акаўнтаў джыхадыстаў у сацсетках было больш за дзесяць тысяч падпісчыкаў. Завербаваных маладых людзей затым фізічна і псіхалагічна рыхтавалі да ажыццяўлення тэрактаў, у тым ліку вучылі валодаць халоднай і агнястрэльнай зброяй. На тое, каб раскрыць сетку, іспанскай паліцыі спатрэбілася два гады.

### Нашчадкі «халіфата»

Паводле даных Europol, у мінулым годзе колькасць тэрарыстычных атак у Еўропе знізілася ў некаторай ступені: баевікам удалося здзейсніць 21 нападзенне, у той час як 119 запланаваных тэрактаў былі папярэджаны. Канешне, агульная лічба ўражвае. Пры гэтым рэалізаваць свае злачынныя планы ўдавалася ў асноўным тэрарыстам-адзіночкам. Джыхадыстаў, якія дзейнічаюць у групе, спецслужбам звычайна ўдаецца своечасова выкрыць і абясшкодзіць.

Нягледзячы на гэтую тэндэнцыю, пагроза тэрактаў у Еўропе па-ранейшаму захоўваецца, прызнаў dw.com эксперт па бяспецы з бельгійскага Інстытута Эгмонт Томас Рэнар. Цяпер тэрарысты ў асноўным дзейнічаюць у адзіночку, нават калі ў іх ёсць сувязі з



джыхадыстамі. «Яны з'яўляюцца нашчадкамі так званага «халіфата» ІД у Сірыі і Іраку і нясуць адказнасць за тое, каб нават пры больш нізкім узроўні тэрарыстычнай пагрозы тэракты адбываліся рэгулярна», — заўважыў аналітык.

Нават пасля разгрому «Ісламскай дзяржавы» сутнасць ісламісцкай прапаганды ў асноўным засталася ранейшая: джыхадзісты нацкоўваюць «добрых мусульман» на «распусны, амаральны Захад», ухваляюць глабальную барацьбу ісламістаў супраць няверных і заклікаюць да помсты за дзеянні Захаду супраць мусульман, тлумачыць Рэнар. Паводле ацэнак эксперта, у поле зроку службаў бяспекі зараз знаходзяцца каля 50 тысяч чалавек, якія пражываюць у Еўропе і маюць сувязі з джыхадзістамі. Многія з іх — гэта баевікі ІД, якія вярнуліся з Сірыі, альбо тыя, хто хацеў далучыцца да гэтай групоўкі, аднак быў спынены на турэцка-сірыйскай мяжы.

Асобасныя характарыстыкі і матывацыя тэрарыстаў у кожным канкрэтным выпадку адрозніваюцца, што абцяжарвае работу спецслужбаў, лічыць Томас Рэнар. Напрыклад, злачынец, які здзейсніў тэракт у Вене, быў прыхільнікам «Ісламскай дзяржавы». У мінулым ён збіраўся адправіцца ў Сірыю, каб ваяваць там на баку ІД, аднак быў затрыманы і ў красавіку мінулага года прыгавораны да 22 месяцаў турмы за ўдзел у дзейнасць тэрарыстычнай арганізацыі. У снежні 2019 года яго датэрмінова вызвалілі. Аб яго шчыльных сувязях з ІД сведчыць і той факт, што гэтая групоўка ўзяла на сябе адказнасць за тэракт у Вене.




У сваю чаргу, злачынец, які ўчыніў нападзенне ў Ніцы, менш кантактаваў з ісламістамі ў рэальным жыцці і, як мяркуецца, далучыўся да радыкальнай ідэалогіі ў інтэрнэце. У многіх падобных выпадках адказнасць за атаку не бярэ на сябе ніводная тэрарыстычная арганізацыя, заўважыў Томас Рэнар.

### Ідэальны шторм

Выступаючы ў пачатку ліпеня на пасяджэнні Савета Бяспекі ААН, генеральны сакратар арганізацыі Антоніу Гутэрыш расказаў, што тэрарыстычныя групоўкі па ўсім свеце выкарыстоўваюць пандэмію каранавіруса, каб пашырыць свой уплыў. Паводле яго слоў, члены такіх арганізацый разглядаюць глабальную нестабільнасць як тактычную перавагу. З ім пагаджаецца шэраг экспертаў. На думку гендырэктара Расійскага савета па міжнародных справах Андрэя Картунова, экстрэмісты могуць скарыстацца сітуацыяй, якая склалася, паколькі, акрамя пандэміі, свет сутыкнуўся і з іншымі сур'ёзнымі праблемамі. «Тое, што зараз адбываецца, можна было б назваць ідэальным штормам. Супала некалькі негатыўных фактараў: з аднаго боку, пандэмія, з другога — падзенне цэн на нафту і звязаная з гэтым эканамічная рэцэсія. Усё гэта стымулюе рэгіянальную нестабільнасць і ўздым радыкалізму. Блізкаўсходнія, афрыканскія, паўднёваазіяцкія краіны — многія дзяржавы вельмі слабыя, інстытуты кволыя, яны не спраўляюцца з наборам праблем, узнікае магчымасць для разнастайных рэлігійных, палітычных радыкалаў захапіць уладу ці проста дэстабілізаваць сітуацыю», — расказаў iz.ru эксперт.

У Іраку і Сірыі на фоне пандэміі зноў узмацнілася групоўка «Ісламская дзяржава», канстатуе Інстытут даследавання праблем міру SIPRI. Эксперты ўпэўнены, што абвал эканомікі толькі пагоршыць канфлікты ва ўсіх рэгіёнах. Дырэктар Стакгольмскага інстытута даследаванняў праблем міру (SIPRI) Дэн Сміт асцерагаецца ўзмацнення тэрарызму на фоне пандэміі каранавіруса SARS-CoV-2. «Гэта асабліва датычыцца Ірака і Сірыі. У Іраку ўжо назіраюцца прыкметы аднаўлення актыўнасці тэрарыстычнай групоўкі «Ісламская дзяржава «(ІГ)», — заявіў Сміт у інтэрв'ю выданням медыягрупы Funke.

Ён адзначыў, што ў Емене канфлікт можа толькі пагоршыцца, а ў Афганістане варта чакаць узмацнення ісламскага радыкальнага руху «Талібан». На думку Сміта, новая эскалацыя напружанасці магчымая ў рэгіёне Афрыканскага Рога і ў заходняй частцы Сахары, напрыклад, у Нігерыі або Малі, бо з-за распаўсюджвання каранавіруснай інфекцыі дзяржаўная інфраструктура вельмі аслабла, і людзі не атрымліваюць неабходнай падтрымкі. «Таму некаторыя далучаюцца да ўзброеных фарміраванняў, у якіх лепшы, напрыклад, доступ да харчавання», — растлумачыў дырэктар SIPRI.

Ужо ў сакавіку, калі большасць краін ЕС толькі пачалі закрывацца на каранцін, баевікі ІД у сваім штотыднёвым бюлетэні «Ан-Наба» заклікалі сваіх прыхільнікаў нанесці ўдар па Захаду. Тэрарысты назвалі пандэмію прыдатным момантам для такіх дзеянняў, бо ўрады заходніх краін апынуліся цалкам занятыя барацьбой з вірусам. Прыкладна ў гэты ж час сваю агітацыю пачалі і тэрарысты з «Аль-Каіды». Баевікі выпусцілі шасцістаронкавы маніфест на англійскай мове, у якім расказалі пра крах эканамічнай гегемоніі ЗША, пра «пакаранне для Захаду» і звязалі пандэмію з «пакараннем найвышэйшых сіл».

### Прадчуванне грамадзянскай вайны

У маі ў дакладзе Блізкаўсходняга навукова-даследчага інстытута (MEMRI) адзначалася, што ў апошні час эксперты назіраюць усплёск інтэрнэт-актыўнасці з боку радыкалаў. Гэта і з'яўленне розных акаўнтаў на Facebook, запуск новых падпольных СМІ і актывацыя ўжо дзеючых Telegram-каналаў. Цалкам магчыма, што агітацыя баевікоў і заклікі атакаваць Захад часткова дабраліся да «мэтавай аўдыторыі».

«Ніца заплаціла занадта высокую цану, як і ўся наша краіна ў апошнія гады», — адзначыў мэр гэтага горада Эстрាзі пасля нядаўняга тэрарыстычнага нападзення. Ён мае рацыю: Францыю сапраўды можна лічыць краінай, якая больш за ўсё ў Еўропе пацярпела ад праблемы радыкалаў за апошнія гады. Ды і сама Ніца станавілася аб'ектам жорсткай атакі не так даўно — у 2016 годзе. Усяго з удзелам радыкалаў у Францыі з 2012-га было здзейснена 40 тэрактаў, у выніку якіх загінулі каля 300 чалавек.

«Нават калі паміж апошнімі нападзеннямі ў Парыжы і Ніцы не будзе выяўлена прамой арганізацыйнай сувязі, яны ствараюць уражанне цэласнай тэрарыстычнай пагрозы, з якой прыходзіцца мець справу французскай дзяржаве», — лічыць эксперт Расійскага савета па міжнародных справах Аляксей Чыхачоў. Ён адзначае, што фактычна гэтая пагроза нікуды не сыходзіла як мінімум з 2015 года.

А цяпер у Францыі намячаецца новая хваля тэрору, заявіў РІА «Навіны» вядучы навуковы супрацоўнік Інстытута Еўропы РАН Сяргей Фёдараў. Прычым французскія палітыкі расцэньваюць апошнія нападзенні радыкалаў як пачатак грамадзянскай вайны. «Гэта пачатак грамадзянскай вайны ў Францыі. Гэтая грамадзянская вайна — вынік некампетэнтнасці, убоства, бяскультур'я і баязлівасці французскага палітычнага класа апошніх 40 гадоў», — заўважыў былы кіраўнік Руху за Францыю, былы кандыдат у прэзідэнты рэспублікі Філіп дэ Вілья.

З ім згодны кіраўнік Народнага рэспубліканскага саюза Франсуа Аселіна. «Усё, здаецца, ідзе да таго, што пачнецца грамадзянская вайна», — сказаў ён РІА «Навіны». Франсуа Аселіна лічыць, што французскі прэзідэнт адкрыў некалькі франтоў, хоць у яго няма прававых, паліцэйскіх, вайсковых сродкаў, каб абараніць французаў ад наступстваў, да якіх вядуць яго заявы.



Гэта, дарэчы, добра разумеюць і грамадзяне Пятай рэспублікі. Большасць французаў лічыць, што дзяржава не здольная абараніць іх ад тэрарыстычных атак. Аб гэтым піша газета Figaro са спасылкай на даныя апытання грамадскай думкі холдынгавай кампаніі Fiducial і аналітычнага цэнтра Odoxa. Так, 76 працэнтаў жыхароў Францыі не вераць у здольнасць урада забяспечыць іх бяспеку ад тэрарызму. Зваротная меркаванне прытрымліваюцца 26 % працэнтаў французаў, што на 18 % менш, чым у ліпені. Акрамя таго, 57 працэнтаў рэспандэнтаў лічаць, што ў месцах рэлігійных набажэнстваў прысутнічае недастатковая паліцэйскіх патрулёў. Як сведчаць апошнія падзеі, такія меркаванні небеспадстаўныя.

**Захар БУРАК.**

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА

**Государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации» (организатор аукциона) по поручению ОАО «Белсельэлектросетьстрой» (продавец) проводит открытый аукцион**

**ПО ПРОДАЖЕ ЗДАНИЯ МАСТЕРСКОГО УЧАСТКА**

**с инв. № 623/С-58461 общей площадью 325,8 кв. м, расположенного на земельном участке с кадастровым номером 625650100005000465 площадью 0,3039 га (право постоянного пользования) по адресу: Минская область, г. Узда, ул. Лесная, 2а.**

Начальная цена объекта с НДС (20 %) – **55 080,00** бел. руб. Задаток 10 % от начальной цены (**5 508,00** бел. руб.).

**Задатки перечисляется на р/с № BY55BPSB3012108260016 9330000 в ЦБУ № 701 ОАО «БПС-Сбербанк», код 369, г. Минск, БИК BPSBBY2X, УНП 690324015, государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации».**

Договор купли-продажи должен быть подписан в течение 10 (десяти) рабочих дней после проведения аукциона. Оплата за объект производится в течение 30 (тридцати) банковских дней после проведения аукциона, если иное не предусмотрено договором купли-продажи. Победитель аукциона (единственный участник аукциона) оплачивает вознаграждение за организацию и проведение торгов в размере 7 (семи) процентов от окончательной цены продажи предмета аукциона и возмещает затраты на организацию и проведение аукциона.

Порядок проведения аукциона и оформления участия в торгах оговорен в условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов www.rlt.by.

Аукцион состоится **05.01.2021 в 14.00** по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, каб. 324. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **04.01.2021** до **16.00** по указанному адресу.

**Тел.: 8 (017) 516-80-65, 516-80-64, 8 (029) 102-21-17, 136-31-11.**

УНП 100120777.

**Организатор торгов:**

**управляющий Унитарного предприятия «Лидский продукт» – ЧП «БелАнтикризисГрупп»**

*(220131, г. Минск, а/я 185, тел. 8029-119-86-66, 8029-777-94-45).*

**Дата и место проведения торгов:** 11.12.2020 в 15.00 по адресу: г. Минск, 4-й переулок Кольцова, д. 51, оф. 618.

**Сведения о продавце:** унитарное предприятие «Лидский продукт» (Гродненская обл., Лидский р-н, Круповский с/с, д. Гуды, ул. Центральная, д. 4, оф. 1).

**Сведения о предмете торгов, начальная цена предмета торгов. Лот № 1:**

**ПРИЦЕП СПЕЦИАЛЬНЫЙ NOR-SLEP PHV-18, РЕГ. № А 9918 А-4, с установление начальной стоимости 3 200,00 белорусского рубля.**

**Порядок проведения торгов.** Шаг аукциона – 5 %. Победителем торгов будет объявлен покупатель, предложивший наибольшую цену. Договор купли-продажи подписывается в 20 дневный срок с даты подписания протокола по результатам торгов. В случае признания торгов несостоявшимися, продажа предмета аукциона продается претенденту на покупку при его согласии по начальной цене, увеличенной на 5 %.

Задаток 5 % от стоимости предмета торгов должен быть зачислен на расчетный счет унитарного предприятия «Лидский продукт» (УНП 591326749): BY36 BELB 3012 1432 3000 1022 6000 в ОАО «Банк БелВЭБ», г. Минск, код BELBBY2X.

Заявки на участие принимаются по адресу: 220131, г. Минск, а/я 185 со дня публикации объявления до 17.00 10.12.2020.

Центр Промышленной Оценки

• Организация аукционов
• Оценка всех видов имущества

ИНФОРМАЦИЯ О ПРОВЕДЕНИИ ТОРГОВ В ФОРМЕ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА

| | | |
|---|---|---|
| **Организатор аукциона** | **ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703** | |
| **Продавец** | **ГЛХУ «Костюковичский лесхоз», 213640, Могилевская обл., г. Костюковичи, ул. Кулешова, д. 101** | |
| Наименование, модель предмета аукциона | Рег. знак | Местонахождение |
| **Автомобиль МАЗ 5337, грузовой автокран** | **ТЕ 0026** | **Могилевская область, г. Костюковичи, пер. Юбилейный, 16** |
| Начальная цена: **20 640,00 бел. руб. с НДС 20 %** | | |
| **Задаток 10 %** от начальной цены предмета аукциона в белорусских рублях перечисляется на счет BY60BLBB30120191021390001001 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по г. Минску и Минской области (адрес банка: г. Минск, ул. Коллекторная, 11), БИК BLBBBY2X, получатель платежа – ЗАО «Центр промышленной оценки», УНП 191021390. Срок внесения задатка: по 04.12.2020 | | |
| **Дата и время проведения аукциона: 08.12.2020 в 13.00** по адресу: г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, пом. 1703. **Дата и время окончания приема документов: 04.12.2020** до 17.00 по адресу: г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, пом. 1703, ЗАО «Центр промышленной оценки» | | |
| Извещение о проведении аукциона опубликовано на официальном сайте Государственного комитета по имуществу (http://gki.gov.by/ru/) 06.11.2020 | | |

**Контактные данные**: +375 (17) 280-36-37; +375 (44) 704-92-06.
**E-mail:** auction@cpo.by

**Управляющий объявляет о проведении торгов по продаже имущества ОАО «Гомельский комбинат строительных конструкций»**

Торги проводятся в форме открытого аукциона.

**Торги состоятся 23 ноября 2020 года в 11.00 по адресу: Гомельская область г. Гомель, ул. Барыкина, 303А.**

Имущество расположено по адресу: **Гомельская область, г. Гомель, ул. Барыкина, 303А.**

Со всей информацией по проведению аукциона можно ознакомиться на сайте Единого государственного реестра сведений о банкротстве: **https://bankrot.gov.by/ManagerSection/ManagerMessages.aspx**

С дополнительной информацией о торгах можно ознакомиться по адресу: г. Гомель, ул. Барыкина, 303А, телефон 8 (0232) 31-53-79, с 9.00 до 15.00. Выходные дни: суббота, воскресенье.

УНН 400063499.

Майстры

# Ружы з халоднага фарфору

## і з цеплыні жаночых рук

**Святлана СТАРЫНСКАЯ з Віцебска вырабляе кветкавыя кампазіцыі з халоднага фарфору. Першае ўражанне тых, хто не ведае пра яе хобі, ад убачанага — сапраўдныя кветкі. На блізкай адлегласці нават падаецца, што яны жывыя. Сярод іншага добра бачны прожылкі на пялёстках, толькі тыя чамусьці не пахнуць. Але, калі майстар дае патрымаць ружу, інтуітыўна на ўзроўні самазахавання людзі бяруць сцябло ніжэй «шыпоў». Такое адчуванне, што насамрэч уколешся!**

Карэспандэнт «Звязды» папрасіў у Святланы правесці майстар-клас. Жанчына, дарэчы, расказала, што навучылася ствараць прыгажосць падчас прагляду аналагічных паказальных заняткаў у інтэрнэце, сур'ёзна захапіўшыся фарфорам гадоў пяць таму. Наконт таго, адкуль увогуле паходзіць тэхніка халоднага фарфору, самая распаўсюджаная версія, распавядае, што яе прыдумалі ў Аргенціне ў пачатку мінулага стагоддзя. У аснове сучаснай сумесі — кукурузны крухмал, клей ПВХ, алей і гліцэрын. Пасля варкі атрымліваецца нешта накшталт пластыліну ці хлебнага мякішу — гэткі прыемны аналаг гліны. Мяць гэты «паўфабрыкат» — задавальненне, бо адчуванне, як у дзяцінстве, калі мама ці бабуля даручала дапамагчы раскатаць цеста. І адначасова працэс супакойвае.

«Канешне, атрымліваецца больш-менш прыгожа стала пасля вялікай колькасці спроб і памылак. Шмат матэрыялу патраціла, пакуль не знайшла ідэальны для сябе «рэцэпт масы» для лепкі», — згадвае суразмоўніца.

Перад пачаткам стварэння кветак яна робіць тэсціраванне «гліны», імкнецца, каб, напрыклад, пялёсткі руж гнуліся і праз некалькі месяцаў. Пакуль сябры не падарылі трафарэт для пражылак, прыкладала да сумесі сапраўдныя кветкі. Увогуле, Святлана стараецца ва ўсім дасягнуць максімальнага падабенства.

Каб зрабіць адну ружу, неабходна гадзін пяцьшэсць. Святлана падкрэслівае, што робіць нешта толькі тады, калі ёсць добры настрой. А на вазон з кветкамі можа патраціць і пару тыдняў. «Зямля» зроблена з заваркі гарбаты. Усё настолькі натуральна, што, паўтаруся, не верыцца ў нейкую штучнасць. Калі працуе, не спяшаецца. Любіць усё рабіць, слухаючы аўдыяверсіі гістарычных раманаў.

Святлана, як, бадай, усе людзі з залатымі рукамі, спачатку рабіла кветкі ў падарунак сваякам, сяброўкам, знаёмым. Потым пачалі прасіць зрабіць аналагічнае іх калегі, знаёмыя.

«Ну і проста вымушана была стаць прафесіянальным стваральнікам кампазіцый з халоднага фарфору», — жартуе майстар.

Цэны на інструменты для работы з халодным фарфорам (цікава, назва аднаго з іх — булька) высокія. Але пачаткоўцам не трэба адразу іх купляць. Можна выкарыстоўваць падручныя сродкі: аловак, зубачысткі, іголкі.

Кошт твораў майстар спачатку не захацела агучваць. Адчувалася, што няма ў яе камерцыйнай жылкі. Урэшце сказала, што за адну ружу, напэўна, папрасіла б рублёў пятнаццаць, а за вазон 40 рублёў, а мо і больш...

Грошы ж яна траціць на матэрыялы і інструменты. Лічыць, што няма мяжы дасканаласці. І якім бы ні быў узровень твораў, можна зрабіць яшчэ лепш. Мастак павінен пастаянна ўдасканальваць сваё майстэрства. І Святлана гэта робіць увесь час, нягледзячы на тое, што сама — інвалід другой групы па зроку.

«Увесь час з дзяцінства насіла акуляры. Вельмі хацела стаць настаўнікам, як мама, ці выхавальнікам. Але мама мяне пашкадавала і адгаварыла, каб са зрокам не з'явілася яшчэ больш праблем», — распавядае майстар.

Што датычыцца адукацыі, яна завочна скончыла палітэхнікум у Мінску. Там атрымала спецыяльнасць, звязаную з эканомікай, атрымала дыплом бухгалтара. А пачынала працоўную дзейнасць у аддзеле кадраў на віцебскім заводзе «Эвістар». У Брэсце, дзякуючы таварыству інвалідаў па зроку, паўгода вучылася на курсах камп'ютаршчыкаў. Інтэрнэтам навучылася карыстацца менавіта там, як і спампоўваць праграмы.

«У тэме, як той казаў. Магу дапамагчы знаёмым, калі нязначныя праблемы з кампом», — усміхаецца Святлана.



Святлана СТАРЫНСКАЯ.

Ёй пакуль няма каму перадаць сакрэты майстэрства. Спадзяецца, што сын створыць сям'ю, дзе і народзіцца ўнучка. Канешне, і ўнуку будзе вельмі рада.

Гутарылі мы, дарэчы, у аддзяленні знаходжання для людзей з інваліднасцю тэрытарыяльнага цэнтра сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва Кастрычніцкага раёна г. Віцебска. Загадчыца гэтай установы Алеся Сярогіна расказала, што творы спадарыні Святланы будуць прадстаўлены на выстаўцы творчасці людзей з абмежаванымі магчымасцямі.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ, фота аўтара.**

Прыемная навіна

# Падарунак ад «Бусліка»

## У Смалявічах урачыста адкрылі яслі-сад № 7 «Буслік». Дашкольная ўстанова разлічана на 230 месцаў

**Для маленькіх жыхароў ужо сфарміравана 12 груп. У тым ліку дзве з іх разлічаны на дзетак ад двух да трох гадоў, чатыры групы прызначаны для выхаванцаў ад трох да чатырох гадоў, астатнія будуць наведваць дзеці ва ўзросце да шасці гадоў.**

Тут створаны цудоўныя ўмовы для ўсебаковага гарманічнага развіцця выхаванцаў, як эстэтычнага, так і маральнага, і фізічнага. Да іх паслуг — музыкальная, трэнажорная, фізкультурная залы, плавальны басейн. Тут аснашчаны сучасным абсталяваннем медыцынскі блок з двума ізалятарамі, працэдурным і фізіятэрапеўтычным кабінетамі, пунктам карэкцыйнай дапамогі і сенсорны пакой. У яслях-садзе будуць адкрыты інтэрактыўны пакой і арт-студыя.

На прылеглай да будынка тэрыторыі абсталяваны пляцоўкі, дзе малыя ў гульнявой форме будуць засвойваць правілы дарожнага руху. На ўваходах у памяшканне ўстаноўлены дамафоны, а ў харчавальным блоку і холах — сістэма відэаназірання. Так што бацькі могуць быць спакойныя за бяспеку сваіх дзяцей.

Адметнасцю дашкольнай установы, якая знаходзіцца непадалёк ад індустрыяльнага парка «Вялікі камень», стане Цэнтр беларуска-кітайскай культуры, дзе ў дзяцей будуць фарміраваць інтарэс да гісторыі, культуры, традыцый Кітая і Беларусі.

**Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ.**




## САРОКА САРОКУ БАЧЫЦЬ ЗДАЛЁКУ

### А ЖАНЧЫНА — ЖАНЧЫНУ

...Калі няма родных братоў ды сясцёр, дык за блізкую радню тады і сяброўкі.

Мы з Вікай у адным пад'ездзе раслі, у адну школу хадзілі, адны і тыя ж фільмы глядзелі і кніжкі чыталі... На канікулы, праўда, раз'язджаліся па сваіх вёсках і бабулях, сумавалі адна без адной, нават ліставаліся, і ў мяне тады пісьмы былі кароткія, бо я не ведала, што ў іх пісаць... Затое ў Вікі — якраз наадварот. Пасля школы яна збіралася стаць філолагам...

Так яно ўрэшце і атрымалася, але ж перад гэтым у яе жыцці — ну далібог, як у доме Аблонскіх! — усё чыста змяшалася. Па-першае, паехаўшы паступаць, Віка без памяці закахалася (і гэта было ўзаемна!). А далей — зацяжарала, выйшла замуж, пераехала да свекрыві, уладкавалася на работу, нарадзіла...

Аднак пры гэтым — што добра — вучобу не кінула: перавялася на завочнае, брала з сабой малога і нейкую з бабуль, і ўтрох яны ехалі здаваць экзамены.

...Пра адзін з іх Віка расказала мне пад вялікім сакрэтам: я паабяцала — нікому з яе радні, з настаўнікаў, з агульных знаёмых... А «ўсяму свету» яно ж можна, як быццам? Тым больш што столькі часу прайшло.

Значыць, Віка здае рускую літаратуру. Выцягвае білет, рыхтуецца расказваць пра жыццё і творчасць Ясеніна.

А прымае той экзамен ці не прафесар: факт, што вельмі, вельмі пажылая жанчына, да таго ж — вялікая знаўца прыгожага пісьменства. Студэнцкае сарафаннае радыё перадавала, што калі ўхітрыцца і падчас адказу на білет «увіцціць» пару вершаў — залік ці экзамен будзе ў кішэні!

Якраз на гэта Віка і разлічвала, бо (малое на руках!) да экзамену падрыхтавалася дрэнна, а вось вершаў ведала процьму. Ну які б прачытаць? Зірнула ў акно, за якім гуляла мяцеліца, і ціха пачала:

*Однажды,*
*в студёную зимнюю пору,*
*Я из лесу вышел;*
*был сильный мороз.*
*Гляжу...*

Глядзела і прафесарка... На Віку... Ва ўсе вочы.

— Ой, гэта ж Някрасаў... Прабачце! — павінілася студэнтка. — Можна я пачну яшчэ раз?

— Калі ласка, — дазволіла экзаменатарка.

Віка зноў паглядзела ў акно і з пафасам выдала:

*Буря мглою небо кроет,*
*Вихри снежные крутя;*
*То, как зверь, она завоет,*
*То заплачет, как дитя...*

Змоўкла... Не таму, што забылася: успомніла свайго Мікітку.

— У мяне сынок, — сказала той прафесарцы. — Сёння ўсю ноч капрызіў — не даў мне паспаць. Але ж я помню: гэта быў Пушкін, а Ясенін... У яго цудоўныя вершы! Зараз... Я толькі збяруся з думкамі, добра?

Прафесар згодна кіўнула і стала чакаць: нават вочы прыплюшчыла. Віка — зноў жа гледзячы ў акно — пачала:

*Ты жива еще,*
*моя старушка?*
*Жив и я.*
*Привет тебе, привет!..*

Прафесар адразу ж, пасля першага радка, «прачнулася», здзіўлена паглядзела на спалоханую студэнтку, цяжанька ўздыхнула, вывела ў залікоўцы чацвёрку і адправіла Віку дамоў.

...Шчасце — гэта і сапраўды, калі цябе разумеюць.

**Любоў Чарнец,**
*г. Барысаў.*

## НА ЧАТЫРОХ НАГАХ

Нездарма кажуць, што багаты дзівіцца, чым бедны жывіцца... Ну і няхай: раскажу.

Значыць, неяк, праходзячы каля сметніка, я ўбачыў там не дужа вялікую, але ж кучу з выкінутай мэблі: нейкіх шафак, столікаў, крэслаў, сярод якіх мой позірк выхапіў адно — скуранoе, кабінетнае, колеру сафары. У мяне дома якраз такое было, у куце стаяла, бо ножка зламалася, а замяніць...

Тут усе «ногі» былі цэлыя, значыць, калі адну адкруціць... Адвёртка патрэбна.

Хуткім крокам я рушыў дамоў, «узброіўся», вярнуўся назад. Крэсла было на месцы, але, як аказалася, звычайнай адвёрткай там нічога не зробіш — патрэбна так званая «зорачка». Таму я зноў падаўся дадому і назад вярнуўся ўжо на ровары (пехатой снаваць ніякага здароўя не хопіць).

Еду, значыць, і думаю, што рэч файная! Такая не паляжыць: як піць даць нехта яе прысабечыць, бо столькі высокіх дамоў вакол... Столькі вокнаў...

Аж бачу, не — стаіць! Я толькі за справу, як раптам:

— Э-э, пастой... Гэта маё крэсла. Жонка, дурніца, выкінула.

— Значыць, пішы прапала, — кажу. — Было тваё, стала маё.

— Не, — упёрся той асталоп і як пацягне рэч да сябе.

Мая «зорачка» ў адзін бок ляціць, балты ў другі... «Во, думаю, гаспадар знайшоўся! Нябось бутэльку хоча сарваць?»

— Добра, — кажу яму, — я куплю ў цябе гэта крэсла.

— А колькі дасі? — насцярожыўся той.

— Пяць рублёў досыць?

— Давай!

Я ў кашалёк, а там — хіба карткі ляжаць.

— Пайшлі, — кажу, — да магазіна. Паўтарачку піва куплю.

— Лепш паўлітра гарэлкі.

А сам зноў за крэсла і цягу... Значыць, майму і далей без ножкі стаяць?

— Не, — кажу, — пачакай.

Ускочыў я на ровар, прывёз гэтаму абэлтуху пляшку беленькай. Абмен адбыўся.

...У той жа дзень я перабраў сваё крэсла — паставіў яго на чатыры нагі, прысунуў да стала, усеўся і напісаў вось гэту гісторыю. Малаверагодна, што ў конкурсе яе прызнаюць найлепшай, але ж нехта, можа, усміхнецца? А хтосьці — яшчэ і даведаецца, дзе шукаць патрэбныя ножкі.

**Віталь Жураўскі,**
*г. Жодзіна.*

## ПАСПЕХ — ЛЮДЗЯМ НА СМЕХ

Згадзіцеся: досыць часта здараецца, што нейкая нікчэмная, смеху вартая дробязь разбурае добра прадуманыя напалеонаўскія планы.

Не ведаю, як тое было з самім Напалеонам, але ж недзе чытаў, што пакуль ён не выправіўся ў маскоўскую вандроўку транзітам праз Беларусь, усё ў яго ішло найлепшым чынам, з-за чаго ў гонар гэтага імператара і сталі называць нават самыя авантурныя задумкі...

Тут і зараз — толькі пра маю... Адну.

Значыць, некалі пасля арміі я вярнуўся дамоў і адразу далучыўся да шматлікай кампаніі дзецюкоў, якія адслужылі раней і цяпер маглі піць ці не ўсё, што гарыць, ды шукаць прыгод. Пажадана любоўных...

У мяне перад гэтымі хлопцамі была істотная перавага: пакуль яны са сваёй бутэлькай «чарніла» ці пляшкай гарэлкі хаваліся ад участковага па розных завуголлях, я мог спакойна зайсці ў адно добрае месца, выпіць-закусіць, нават застацца нанач.

І ўсё — дзякуючы бацьку. Адразу пасля вайны ён уладкаваўся працаваць у лясніцтва, стаў добрым леснікам, але аднойчы зваліўся з воза і зламаў нагу. Дзякаваць богу, услед за ім ехаў яшчэ адзін воз і нават сам ляснічы — на матацыкле з люлькай... Якраз у ёй пацярпелага дамчалі да бальніцы — нагу «злажылі», праўда, неяк няўдала...

Ламаць свае косці яшчэ раз бацька адмовіўся, так што хадзіць яму стала куды цяжэй, а ўжо на вялікія дыстанцыі ды па лесе дык і наогул... Давялося згадзіцца на пасаду вартаўніка. Заробак у выніку стаў меншы, але затое амаль цэлымі днямі бацька быў дома, даглядаў гаспадарку, з якой наша сям'я і жыла. А бліжэй да ночы ён ішоў вартаваць — сам будынак лясніцтва, трактар, канюшню на восем коней, вялікае гумно з сенам... Для чалавека немаладога ды кульгавага тэрыторыя была немалая, таму ахоўваць яе дапамагаў сабака па мянушцы Барбос...

Я таксама ўбаку не стаяў: яшчэ школьнікам і да службы ў войску, калі бацька адчуваў сябе кепска, падмяняў яго. А таму добра ведаў і паднаглядную тэрыторыю, і сабаку, і тое, у якім кутку ляжаць афіцэрская плашч-палатка, якая служыла вартаўніку прасціной, мяшок з сенам замест падушкі, старая ватная коўдра ды некалькі такіх жа посцілак...

І яшчэ адна досыць важная акалічнасць: за тры гады службы ў Запаляр'і жывую жанчыну я бачыў толькі чатыры разы. Гэта здаралася, калі, днявалячы на КПП, расчыняў вароты перад «козлікам» камандзіра часці, а побач з ім сядзела жонка...

Можа, таму пасля арміі я быў вельмі падобны на таго пеўня, які, убачыўшы курыцу, думае: не даганю, дык хоць сагрэюся...

Праўда, тут, дома, бегчы не было за кім: усе дарослыя дзяўчаты ўжо мелі па кавалеру, а самыя прыгожыя дык нават па некалькі. Заляцацца да нейкай старшакласніцы здавалася мне заняткам доўгім і турботным. Так што заставалася хіба залётніца — Галя-гастралёрка, якая (калі верыць сябрам) перажыла ўжо шмат няўдалых «каханняў» і зараз шукала новае. А таму перспектыва закруціць з ёй раман выглядала цалкам рэальнай.

Да таго ж на дварэ быў май, субота, у клубе — вяселле, танцы і не пад нейкія там заезджаныя пласцінкі, а пад сапраўдны аркестр — акардэон, бубен і цымбалы...

Ад душы пад іх наскакаўшыся, я прапанаваў Галіне трохі адпачыць — пасядзець дзе-небудзь у зацішку, пасля чаго (як не сорамна ў тым прызнавацца) павёў яе не ў калгасны сад, не да рэчкі, а ў бок лясніцтва.

Ноч тады была ціхая-ціхая, настрой — самы што ні ёсць рамантычны, можа, нават узнёслы, а далей...

Ужо на подступах да «аб'екта» нам насустрач выскачыў радасны Барбос, «пацалаваўся» са мной, досыць стрымана павітаў Галіну і пабег наперад — як бы «паказваць» дарогу. Аднак пры гэтым слуп не прапусціў — спыніўся, каб пад самым ліхтаром справіць патрэбу.

— Во гультай! Ён нават лапу не падняў, — здзівілася Галя.

— Стары... Яго і да «дзевак» ужо не цягне, — галантна паддакнуў я.

Галя чамусьці зарагатала, а сабака, відаць, абразіўся, бо аж зайшоўся ад брэху...

На гэты шум з канторы выскачыў заспаны бацька. Пазнаў мяне і хацеў супакоіцца, але, убачыўшы Галю, не стрымаўся — плюнуў і загнуў такога мацюка...

Дзеўка рванула ходу. Барбос яшчэ раз загаўкаў.

— Каб ты здох! — пажадала яму Галіна.

А я пасля гэтага мусіў зайсці да бацькі ў кантору, выслухаць яго доўгую гнеўную мараль і толькі потым пайсці дадому.

З Галяй мы больш не сустракаліся, бо яна досыць хутка з'ехала на нейкую камсамольскую будоўлю.

А Барбос — застаўся, гады са два пажыў яшчэ. Ды і потым я зрэдку ўспамінаў яго. Успамінаў з удзячнасцю, бо калі б не ён...

Хто ведае, як склалася б тая майская ноч, наступны дзень ды і жыццё ўвогуле.

**Б. К.,** *г. Глыбокае.*

**Рубрыку вядзе Валянціна ДОЎНАР.**

Неасабісты суб'ектыў



# Я ВЕДАЛА АДНАГО ПАЭТА...

## Чаму ўвосень важна чытаць кнігі вершаў

Я ведала аднаго паэта. Спачатку, напэўна, як і большасць маіх равеснікаў з журфака ды філфака, — завочна. На пачатку дзевяностых яго імя было ў колах студэнтаў-гуманітарыяў гэткай эпатажнай легендай, пра яго, старэйшага на нейкія пятнаццаць гадоў, з несхаванай зайздрасцю і захапленнем расказвалі бывальшчыны і небывальшчыны. Мала хто з нас мог працытаваць хоць бы радок з якога яго верша, затое ўсе ведалі і пераказвалі ў падрабязнасцях гісторыю з каструляй баршчу, якую ён прынёс на пасяджэнне пісьменніцкага саюза і паставіў перад кімсьці з мэтраў (перад Максімам Танкам, калі не памыляюся). Ён падаваўся сапраўдным сімвалам таго крыху вар'яцкага, адвязнага часу, калі здавалася, што можна ўсё, і ты сапраўды свабодны, калі пераступаеш нейкую мяжу.

Упершыню ўжывую я яго ўбачыла ў Доме літаратара на творчай вечарыне Данчыка (памятаеце, быў такі салодкагалосы спявак з амерыканскай дыяспары). Выйшаўшы на сцэну з бутэлькай спірту «Раял» у руцэ, паэт здорава напалохаў і прысутную публіку, і самога заморскага госця, які паспяшаўся збегчы за кулісы. Мы пасля доўга абмяркоўвалі гэты скандал паміж сабой, мой аднакурснік нават напісаў аб гэтым замалёўку ў факультэцкую газету. Але ніхто з нас зноў не кінуўся чытаць вершы паэта, які так уразіў сваім чарговым учынкам на мяжы прыстойнасці.

З яго творчасцю і з ім самім асабіста я пазнаёмілася адначасова — годзе ў 97-м яго запрасілі ў «Звязду» весці рубрыку «Глыбы і слаі», прысвечаную літаратуры, а мне даручылі рыхтаваць яго матэрыялы да друку. Памятаю, здзівіла і прыемна ўразіла яго валоданне беларускім словам — нават публіцыстыку ён пісаў лёгка, бы вершы. Самога ж яго я крыху пабойвалася: у вечным чорным скураным плашчы, не заўсёды цвярозы, з грубаватым голасам (а яшчэ дадайце сюды шлейф легендаў і праўдзівых гісторый), ён здаваўся зялёнай журналістцы гэткай глыбай, якую лепш абыходзіць бокам. Старэйшыя калегі з гэтай прычыны з мяне нават кпілі: «Алена, хавайся, Сыс ідзе!»

Нашы насцярожаныя сустрэчы ў рэдакцыі скончыліся, калі ён адмовіўся працягваць весці рубрыку. А незадоўга да гэтага, зайшоўшы ў кабінет, працягнуў вузкі лісток — не паперы нават — рудога кардону, на зваротным баку якога былі нейкія лічбы, лагарыфмічная табліца, здаецца. «Гэта табе, чытай!» «Дзяўчына з вачыма колеру піва»... У мяне ж блакітныя вочы...» «Чуеш, малая, не выдумляй! Што ты разумееш у паэзіі!»

